Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

ОРГАН ЦК і МЕНСКАГА АБКОМА КП(б)Б

№ 128 (6405) | 6 чэрвеня 1939 г., аўторак | ЦАНА 10 КАП.

СЕННЯ Ў НУМАРЫ:

У ЦК ВКП(б). Сфарміраванне Камісіі Партыйнага Кантроля пры ЦК ВКП(б) (1 стар.).

Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР аб увекавечанні памяці герояў Хасана (1 стар.).

Заключны канцэрт дэкады кіргізскага мастацтва (1 стар.).

У Прэзідыуме ВЦСПС (1 стар.).

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ: С. Ляснеўскі, А. Кузняцоў — Партыйна-масавая работа на будаўніцтве; С. Куцаеў — Армейскія большэвікі авалодваюць марксізмам-ленінізмам (2 стар.).

П. А. Карыхалаў — Народны геній (140 год з дня нараджэння А. С. Пушкіна) (2 стар.).

З. Ларысаў, В. Палякоў — Мясцовыя рэсурсы Суражскага раёна (2 стар.).

Г. Н. Катляроў — Поўнасцю сабраць пазыковыя ўзносы на вёсцы (2 стар.).

ГРАМАДСКАЯ ЗЯМЛЯ КАЛГАСАЎ СВЯШЧЭННА І НЕДАТЫКАЛЬНА: Н. Гіршын—У чаканні дырэктыў; В. Пышкоў, Ф. Патапейка — Павысілася прапоўная дысцыпліна. Выпраўляюць дапушчаныя нарушэнні статута; Нік. Вішнеўскі — Поле шуміць ураджаем (3 стар.).

МАЛЕНЬКІ ФЕЛЬЕТОН: С. Краўцоў—А суддзі дзеі (3 стар.).

Германія сёння (агляд замежнага друку) (3 стар.).

Поспех выстаўкі совецкай кнігі і мастацкай фатаграфіі ў Анкары (4 стар.).

Вынікі выбараў венгерскага парламента (4 стар.).

Да перагляду закона аб нейтралітэце ў ЗША (4 стар.).

Ваенныя дзеянні ў Кітаі (4 стар.).

ДАДЗІМ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ БАЯВОЕ ПАПАЎНЕННЕ!

Праз некалькі месяцаў пачнецца прызыў у Рабоча-Сялянскую Чырвоную Армію і Ваенна-Марскі Флот маладых совецкіх грамадзян, нарадзіўшыхся ў другой палавіне 1918 года і ў 1919 годзе. Пад баявыя сцягі Чырвонай Армії стане новы атрад палкіх патрыётаў сваёй вялікай радзімы, гатовых абараняць яе, не шкадуючы сіл і самога жыцця.

У нашай краіне воінская служба—свяшчэнны доўг, пачотны абавязак кожнага маладога совецкага грамадзяніна. На скрыжалях Сталінскай Канстытуцыі залатымі літарамі гараць словы: «Абарона бацькаўшчыны ёсць свяшчэнны абавязак кожнага грамадзяніна СССР». Маладыя рабочыя, калгаснікі, служачыя з радасцю і энтузіязмам, гордыя чэсцю, вынаўшай на іх долю, ідуць у Чырвоную Армію пабольшэвіцку авалодваць баявой тэхнікай, каб з чэсцю, мужна і ўмела абараняць сваю вялікую радзіму ад нападу ворагаў.

Дні прызыва сталі ў нас днямі народных свят. Бацькі, праважаючы сына, даюць наказ: — Будзь стойкім байцом. Не шкадуючы сіл, вучыся ваеннай справе. Беспярэчліва выконвай загады камандзіраў і начальнікаў, як зяніцу вока, захоўвай ваенную тайну. Памятай—майстэрства метка страляць, вытрымка валодаць баявыя машыны, без промаху паражаць ворага патрэбна тваёй маперы-радзіме.

«Наш народ любіць мір, цэніць яго вялікія блага і змагаецца за мір ва ўсім свеце. Але ён умее і ваяваць. І не толькі ўмее, але і любіць ваяваць. І калі зарваўшыяся агрэсары калі-небудзь прымусяць Совецкі народ узяцца за зброю, ён будзе біцца з той-жа страсцю і ўменнем, з якімі ён біў сваіх ворагаў 17 год таму назад, з якімі будуе цяпер сваё новае сацыялістычнае жыццё і не складзе зброі да поўнай і канчатковай перамогі».

Гэтыя словы народнага камісара абароны, маршала Совецкага Саюза таварыша Варашылава красамоўна выражаюць пачуцці, якімі поўны серцы працоўных нашай сацыялістычнай дзяржавы. Совецкі народ, свята памятаючы словы свайго правадыра і настаўніка вялікага Сталіна, жаспынна ўмацоўвае баявую магутнасць сваіх перадавых атрадаў, сваіх аванпостаў Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота.

Чырвоная Армія, выхаваная і загартаваная мудрай партыяй Леніна—Сталіна,—гордасць вялікага народа, верная абаронца яго ад знешніх ворагаў. Совецкі народ нястомна клапоціцца аб сваёй арміі, пасылае ў яе рады лепшых сваіх сыноў, беззаветна адданых справе комунізма, справе партыі Леніна—Сталіна.

Совецкі народ не шкадуе сродкаў, каб падняць абаронную магутнасць сваёй краіны на недасягальную вышыню. Аднадушнасць, з якой народныя выбраннікі — депутаты Вярхоўнага Совета СССР— адобрылі прапанову ўрада асігнаваць у дзяржаўным бюджэце на 1939 год 40.885 мільёнаў рублёў на патрэбы абароны краіны, горача раздзяляецца ўсім народам.

Наша моладзь поўна гарачай любві да сваёй цудоўнай радзімы. У славу радзімы яна здольна на гераічныя справы і бясстрашныя подвігі. Мужнасць, храбрасць, благароднае імкненне да подвігаў у імя радзімы — неад'емныя рысы кожнага маладога совецкага грамадзяніна. Совецкай моладзі ёсць з каго браць прыклад палкага совецкага патрыятызма: подвігі герояў-хасанаўцаў, слаўныя справы бясстрашных совецкіх сокалаў-лётчыкаў напаўняюць кожнага маладога чалавека нашай краіны імкненнем быць падобным на іх, гэтак-жа самаалдана, як і яны, узнімаць баявую славу радзімы.

Выдатнае папаўненне ласць Чырвонай Арміі Совецкая Беларусь. Сярод прызыўнікоў многа скончыўшых інстытуты, тэхнікумы, дзесяцігодкі. У Гомелі, напрыклад, каля 30 проц. прызыўнікоў маюць вышэйшую і сярэднюю асвету. Прызыўнікі з энергіяй і ўзлымам павышаюць свой агульнаасветны ўзровень, імкнучыся прысці ў Чырвоную Армію ўсебакова развітымі людзьмі.

Прызыўнікі нястомна авалодваюць ваеннымі ведамі, фізкультурай, умацоўваюць сілу сваіх мускулаў, каб да ўходу ў Чырвоную Армію авалодаць начаткамі ваенных ведаў, стаць моцнымі і вынослівымі.

Былы слесар камбіната «Спартак» (Гомель) прызыўнік В. В. Кублік без адрыву ад вытворчасці авалодаў тэхнікай прыжкоў з парашутам. Яшчэ ў 1936 годзе ён зрабіў свой першы прыжок. Зараз т. Кублік—інструктар парашутнага спорта, умее вадзіць самалёт. У яго паслужным спіску 63 прыжкі, у тым ліку некалькі эксперыментальных. Ён бясстрашна пакідаў самалёт, правяраючы парашуты, прыгаў з розных фігур вышэйшага пілатажа. Тав. Кублік падрыхтаваў капітоўны падарунак радзіме — ім абучаны парашутнай справе 35 прызыўнікоў. Яны зрабілі па 6 прыжкоў з самалёта.

Комсамолец-прызыўнік А. А. Шуба мае ўсе абаронныя значкі і апрача таго ўладае тэхнікай валаазнай справы. Ён абучыў 15 прызыўнікоў валаазнай справе. Не раз т. Шуба з чэсцю выконваў складаныя заданні, звязаныя са спускам у ваду на прэхзельныя глыбіні.

Многа прызыўнікоў—снайперы, кулямётчыкі, вадзіцелі аўтамашын, матацыклісты.

Падрыхтоўка да прызыва пачалася ва ўсіх абласцях рэспублікі. Яна ідзе непараўнальна лепш, чым у мінулым годзе. Пытаннямі прызыва ўшчыльную, сур'ёзна займаюцца многія партыйныя і комсамольскія арганізацыі. Але нельга закрываць вочы на той факт, што не ўсюды яшчэ ў Беларусі партыйныя арганізацыі ўзялі справу падрыхтоўкі да прызыва пад неаслабны кантроль. Дзяржынскі райком КП(б)Б яшчэ не займаўся пытаннямі падрыхтоўкі да прызыва, а між тым у гэтым раёне яўна нездавальняючы ахват прызыўнікоў вучобай у розных ваенных гуртках. На заводзе імені Сталіна ў Гомелі ні партыйная ні комсамольская арганізацыі не ведаюць, колькі на заводзе прызыўнікоў. Гэты факт сведчыць аб тым, што некаторыя партыйныя арганізацыі захіліліся ад аператыўнага кіраўніцтва падрыхтоўкай да прызыва, і, як правіла, гэта адбіваецца на якасці работы з прызыўнікамі. Такое становішча нецярпіма.

Прызыў у Чырвоную Армію—справа вялікай дзяржаўнай важнасці. Выдатнае правядзенне прызыва—кроўная справа кожнай партыйнай і комсамольскай арганізацыі. Неабходна, не марудзячы, заняцца пытаннямі прызыва, дапамагчы масавым абаронным і фізкультурным арганізацыям як належыць арганізаваць работу сярод прызыўнікоў. Справа першаступенная важнасці — арганізаваць работу так, каб усе прызыўнікі займаліся ў ваенных гуртках. Нельга мірыцца з такімі, напрыклад, паказальнікамі, якія дае Гомель, дзе толькі 20 процантаў прызыўнікоў—варашылаўскія стралкі, 14,4 проц.—значкісты ГПА першай ступені. Зусім нецярпіма становішча ў Віцебскай вобласці, дзе ўсяго толькі 8,5 проц. прызыўнікоў—варашылаўскія стралкі.

Асабліва адказныя задачы ўстаюць перад ваеннымі аддзеламі, абавязкам якіх з'яўляецца «...аказваць дапамогу ваенным органам у справе пастаноўкі ўчоту ваенна-абавязаных, арганізацыі прызыва, мабілізацыі ў выпадку вайны, у справе арганізацыі процівапаветранай абароны і т. д.» (са Статута ВКП(б).

Прызыў — гэта першы экзамен для кіраўнікоў і работнікаў ваенных аддзелаў. Гэты экзамен трэба вытрымаць на «выдатна».

Таварыш Сталін у сваім дакладзе на XVIII з'ездзе ВКП(б) высунуў задачу «развіваць і культывіраваць совецкі патрыятызм». Рэалізацыя гэтай задачы павінна пранізаць усю палітычную работу сярод прызыўнікоў. Да прызыўнікоў трэба пасланць лепшых прапагандыстаў і паставіць справу палітычнага выхавання так, каб кожны з прызыўнікоў добра ўсвядоміў мэты і задачы Чырвонай Арміі, вывучаў яе баявую гісторыю і слаўныя традыцыі. Асабліва важна аказаць дапамогу прызыўнікам у справе ўсваення рашэнняў XVIII з'езда ВКП(б).

На «выдатна» падрыхтавацца да адказнай і пачотнай ваеннай службы павінен кожны прызыўнік.

Дадзім Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскому Флоту культурнае, фізічна загартаванае баявое папаўненне! Умацуем нашу доблесную Чырвоную Армію новым атрадам палкіх патрыётаў сваёй вялікай радзімы, бязмежна адданых партыі Леніна—Сталіна, ластойных вялікага і адказнага звання воіна Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота.

Мітынг на менскай фабрыцы «Кастрычнік», прысвечаны вынікам Трэцяй Сесіі Вярхоўнага Совета СССР. НА ЗДЫМКУ: дэпутат Вярхоўнага Совета СССР В. Г. Ванееў выступае з дакладам аб выніках работы Сесіі.

Фото І. Другуля.

РАШЭННІ ТРЭЦЯЙ СЕСІІ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР ВЫКЛІКАЛІ Ў КРАІНЕ НОВЫ ТВОРЧЫ ЎЗДЫМ

ДАТЭРМІНОВА ВЫКАНАЕМ ПОЎГАДАВУЮ ПРАГРАМУ

Працяжны гудок абвясціў аб скančэнні работы першай змены. Каля двух тысяч рабочых, работніц і інжынерна-тэхнічных работнікаў менскай фабрыкі «Кастрычнік» сабраліся ўчора на мітынг, прысвечаны вынікам Трэцяй Сесіі Вярхоўнага Совета СССР.

З выключнай увагай выслухаў рабочы калектыў даклад дэпутата Вярхоўнага Совета СССР тав. Ванеева, які проста і ясна расказаў аб важнейшых рашэннях Сесіі, накіраваных на далейшы росквіт краіны сацыялізма, на ўмацаванне яе абаронnай магутнасці, на ўздым добрабыту працоўных.

Асабліва жыва рэагавалі прысутныя на словы дакладчыка, калі ён гаварыў аб асігнаванні па бюджэту звыш 40 мільярдаў рублёў на абаронныя мерапрыемствы.

— Асігнаванне 40 мільярдаў 885 мільёнаў рублёў на патрэбы Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота, — гаворыць тав. Ванееў, — сведчыць аб велізарным росце нашай краіны, аб яе невычарпальным багацці. За гэтыя сродкі мы будзем мець новыя магутныя танкі, новыя быстраходныя самалёты, ваенныя караблі, гарматы, самыя рознастайныя віды ўзбраення, неабходныя для абароны радзімы. І гора будзе ворагу, які паспрабуе пасягнуць на нашу свяшчэнную зямлю, ён адчуе сілу двайнога ўдара магутнага 170-мільённага совецкага народа.

Гэтыя словы дакладчыка пакрываюцца бурным шквалам апладысментаў.

На трыбуне — начальнік 3-га цэха фабрыкі тав. Лальшаў. Выказваючы думкі і пачуцці ўсяго рабочага калектыва, ён заяўляе:

— Рашэнні Трэцяй Сесіі Вярхоўнага Совета СССР сустрэлі аднадушнае адабрэнне ўсяго совецкага народа, бо яны адлюстроўваюць яго волю, яго імкненні, бо яны накіраваны на далейшае ўмацаванне нашай радзімы, на рост добрабыту працоўных. Мы адабраем 40-мільярднае асігнаванне на патрэбы РСЧА і Ваенна Марскога Флота, што палкам адпавядае міжнароднай абстаноўцы і задачам абароны нашай радзімы. Будзем з дня на дзень паляпшаць нашу работу, каб датэрмінова выканаць Трэцюю пяцігодку і гэтым паскорыць пераход ад сацыялізма да комунізма.

У аднадушна прынятай рэзалюцыі рабочыя фабрыкі адабраюць рашэнні Сесіі.

Рабочы калектыў абавязаўся выканаць поўгадовую праграму да 20 чэрвеня, поўнасцю асвоіць новыя фасоны на працягу 8 дзён і даць спажыўцу высокаякасную прадукцыю, больш разгарнуць абаронную работу на фабрыцы і ліквідаваць непісьменнасць па ПХА.

Наша краіна непераможна

Каля 500 рабочых, служачых і інжынерна-тэхнічных работнікаў менскага чырвонасняжнага скурзавода «Большэвік» сабраліся ўчора пасля работы на мітынг, прысвечаны абмеркаванню вынікаў Трэцяй Сесіі Вярхоўнага Совета СССР. Цёпла сустрэты, на мітынгу з прамовай выступіў дэпутат Вярхоўнага Совета СССР тав. Ванееў. Не раз у зале ўспыхвалі апладысменты ў чэсць Совецкага ўрада, у чэсць вялікага Сталіна і яго баявога саратніка таварыша Молатава.

Рабочыя, інжынерна-тэхнічныя работнікі ў сваіх выступленнях гаварылі аб велізарным значэнні рашэнняў Трэцяй Сесіі Вярхоўнага Совета СССР, накіраваных на далейшае ўмацаванне магутнасці краіны сацыялізма і рост добрабыту працоўных.

— Рашэнні Трэцяй Сесіі Вярхоўнага Совета СССР, — сказаў у сваім выступленні інжынер тав. Капялевіч, — выражаюць волю і імкненні ўсяго шматмільённага совецкага народа ісці хутчэй уперад, да комунізма. Кожны з нас з асаблівым задаваленнем сустрэў зацвярджэнне павелічэння асігнаванняў на яшчэ большае ўмацаванне Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота.

У прынятай на мітынгу рэзалюцыі рабочыя, інжынеры, тэхнікі і служачыя чырвонасняжнага скурзавода «Большэвік» палкам і поўнасцю адабраюць рашэнні Сесіі.

«Мы абавязваемся, — гаворыцца ў рэзалюцыі,—замацоўваць дасягнутыя вытворчыя поспехі, яшчэ шырэй разгарнуць стаханаўскі рух і абаронную работу і дабіцца да 15 чэрвеня датэрміновага выканання 6-месячнай вытворчай праграмы, а да 12 снежня — дня гадавіны выбараў ў Вярхоўны Совет нашай вялікай сацыялістычнай радзімы—выкананне гадавога плана».

Яшчэ больш павысім якасць вучобы

ВІЦЕБСК, 5 чэрвеня. (Кар. «Звязды»). Сёння ў клубе Ветэрынарнага інстытута адбыўся агульны сход студэнтаў і навуковых работнікаў інстытута, прысвечаны вынікам III Сесіі Вярхоўнага Совета СССР.

Дырэктар інстытута дэпутат Вярхоўнага Совета СССР праф. Грыгорый Якаўлевіч Белкін выступіў з падрабязным дакладам аб рабоце Сесіі.

Заключныя словы дакладчыка аб тым, што ўсе пытанні, якія стаялі на Сесіі, вырашаліся з вялікай аднадушнасцю, адлюстроўваюць адзінства і згуртаванасць усяго совецкага народа вакол сваёй роднай большэвіцкай партыі, урада і вялікага Сталіна, — былі пакрыты гарачымі апладысментамі.

Па дакладу тав. Белкіна выступілі студэнты тт. Краўчанка, Сініцын, Ткачэнка і інш. Гарачым адабрэннем усіх рашэнняў Сесіі былі прасякнуты іх прамовы.

У прынятай рэзалюцыі калектыў інстытута абавязваецца яшчэ вышэй падняць якасць вучобы і змагацца за ператварэнне інстытута ў непрыступную крэпасць абароны.

З. ЛАРЫСАЎ.

За ўзорную пагранічную магістраль

Ва ўсіх падраздзяленнях Беларускай дарогі праходзяць мітынгі, сходы, прысвечаныя вынікам работы III Сесіі Вярхоўнага Совета СССР.

На многалюдным мітынгу работнікаў Упраўлення дарогі з дакладам аб выніках работы Сесіі выступіў дэпутат Вярхоўнага Совета СССР нам. начальніка дэпо Гомель тав. С. П. Астапаў. Ён падрабязна расказаў аб рашэннях Сесіі і заклікаў работнікаў Упраўлення дарогі палепшыць сваю работу, шырока разгарнуць масава-абаронную работу з тым, каб ператварыць Беларускую дарогу ва ўзорную пагранічную магістраль.

У сваіх рэзалюцыях чыгуначнікі Беларусі абавязваюцца шырэй разгарнуць сацыялістычнае спаборніцтва імені Трэцяй Сталінскай Пяцігодкі, пачаць дзейную падрыхтоўку да зімы, актыўна змагацца за выкананне рашэнняў III Сесіі.

Р. СЫРКІН.

ЗАКЛЮЧНЫ КАНЦЭРТ ДЭКАДЫ КІРГІЗСКАГА МАСТАЦТВА

НА КАНЦЭРЦЕ ПРЫСУТНІЧАЛІ ТАВАРЫШЫ І. В. СТАЛІН, В. М. МОЛАТАЎ, Л. М. КАГАНОВІЧ, М. І. КАЛІНІН, А. А. АНДРЭЕЎ, А. І. МІКАЯН, А. А. ЖДАНАЎ, Г. М. МАЛЕНКОЎ

Незвычайны росквіт культуры народа, адроджанага Вялікім Кастрычнікам, прадэманстравала дэкада кіргізскага мастацтва, якая закончылася, яркім святам. Заключны канцэрт дэкады, які адбыўся 4 чэрвеня ў Дзяржаўным ордэна Леніна Акадэмічным Вялікім тэатры СССР, з'явіўся буйнай падзеяй у музыкальным жыцці сталіцы.

Урачысты і святочны быў выхад усіх удзельнікаў дэкады. Народныя спевакі і музыканты, вядомыя артысты кіргізскага тэатра і філармоніі запоўнілі сцэну.

Канцэрт адкрыўся выступленнем народных артыстаў рэспублікі акынаў-ордэнаносцаў Алымкула Усенбаева і Калыка Акіева. Народныя спевакі прапелі ў гэты вечар «Прывітанне вялікаму Сталіну ад кіргізскага народа». З велізарным натхненнем выканалі затым усе ўдзельнікі дэкады «Песню аб Сталіне».

Праграма канцэрта была выключна рознастайна. З поспехам выступалі аб'яднаны хор Кіргізскага Дзяржаўнага музыкальнага тэатра і Кіргізскай Дзяржаўнай філармоніі. З сапраўднымі народнымі мелодыямі, з якіх цяпер нараджаецца нацыянальная музыка складаных форм, масквічоў пазнаёмілі выдатныя выканаўцы на рознастайных народных інструментах (камуз, кыяк, сурнай) — народныя артысты рэспублікі Мураталы Курэнкееў, Карамалдо Орозаў, Атай Оганбаеў з сваімі вучнямі, заслужаны артыст рэспублікі Муса Баетаў, артыст Сеіт Мекмуратаў, калгаснікі Джунусалы Кутубаеў і Серэк Ельтаеў.

Жывую цікавасць выклікалі ўрыўкі з выдатнага кіргізкага эпаса «Манас» у выкананні вядомых сказіцеляў (манасчы) — народных артыстаў рэспублікі Малдабасана Мусулманкулава і Саякбая Каралаева.

Велізарны поспех выпаў на долю Кіргізскага Дзяржаўнага аркестра народных інструментаў, а таксама спевакоў-салістаў заслужанага дзеяча мастацтваў Абдыласа Малдыбаева, заслужаных артыстаў рэспублікі Сайры Кіізбаевай, Анвар Кутубаевай, Мусы Баетава і інш.

Цёпла быў прынят жаночы ансамбль тэмір-камузістак пад кіраўніцтвам Адамгалы Байбатырава, па-майстэрску выканаўшых некалькі народных мелодый.

У канцэртнай праграме было шырока прадстаўлена і хорэаграфічнае мастацтва. Аб'яднаная балетная група музыкальнага тэатра і філармоніі выдатна выканала танцы «Кііз», «Джаш кербеш» і танец чабанаў, пастаўленыя балетмейстэрам Н. С. Холфіным. З поспехам выступіў таксама ансамбль Ошскага Дзяржаўнага нацыянальнага тэатра, які выканаў некалькі узбекскіх танцаў.

Канцэрт азнаёміў грамадскасць сталіцы з маладымі нацыянальнымі балетнымі кадрамі, якія клапатліва вырошчвае кіргізскі народ. Шумны поспех мела кіргізская група Ленінградскага Дзяржаўнага хорэаграфічнага вучылішча. Выступленне юных танцораў, сярод якіх ёсць васьмігадовыя дзеці, паказала, што кіргізскі тэатр хутка атрымае першы атрад таленавітых танцораў, дасканала аўладаўшых культурай еўрапейскага танца.

Канцэрт закончыўся песняй «Шчасце народа», якую з вялікім ўздымам выканалі ўсе ўдзельнікі дэкады. Пасля скančэння канцэрта ў зале доўга не спіхала шумная авацыя, якой слухачы віталі ўдзельнікаў дэкады кіргізскага мастацтва.

На заключным канцэрце прысутнічалі таварышы І. В. Сталін, В. М. Молатаў, Л. М. Кагановіч, М. І. Калінін, А. А. Андрэеў, А. І. Мікаян, А. А. Жданаў, Г. М. Маленкоў.

(ТАСС).

УКАЗ

ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР АБ УВЕКАВЕЧАННІ ПАМЯЦІ ГЕРОЯЎ ХАСАНА

У мэтах увекавечання памяці герояў Хасана:

1. Пераіменаваць Пасьецкі раён Прыморскага края ў Хасанскі раён.
2. Пабудаваць памятнік у раёне хасанскіх баёў. Збудаванне памятніка даручыць Оргкамітэту Прэзідыума Вярхоўнага Совета РСФСР па Прыморскаму краю.
3. Устанавіць дзень 6-га жніўня святам 1-й Асобнай Чырвонасцяжнай Арміі, як дзень генеральнай атакі часцей 1-й Асобнай Чырвонасцяжнай Арміі, узяцця вышыні Заазёрнай і ачышчэння совецкай зямлі ад японскіх захватчыкаў.
4. Устанавіць нагрудны значок удзельнікам хасанскіх баёў.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР М. КАЛІНІН.

Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР А. ГОРКІН.

Масква, Крэмль, 5 чэрвеня 1939 г.

ХРОНІКА

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Совета РСФСР ад 5 чэрвеня г. г. ліквідавана Прыморская вобласць Прыморскага края. Раёны, якія ўваходзілі ў Прыморскую вобласць, падпарадкаваны непасрэдна краявым арганізацыям. (ТАСС).

У ПРЭЗІДЫУМЕ ВЦСПС

На адбыўшымся ў канцы мая VI пленуме Усесаюзнага міжсекцыйнага бюро інжынераў і тэхнікаў было прызнана нямэтазгодным самастойнае існаванне ўнутры профсаюзаў секцый інжынерна-тэхнічных работнікаў. Пленум указаў таксама на неабходнасць больш шырока прыцягваць інжынераў і тэхнікаў да актыўнага ўдзелу ў агульнай рабоце профсаюзаў. Прэзідыум ВЦСПС зацвердзіў пастанову VI пленума Усесаюзнага міжсекцыйнага бюро інжынераў і тэхнікаў.

Усім профсаюзным арганізацыям прапанавана ў час выбараў забяспечыць вылучэнне ў састаў прафорганаў актыўных інжынерна-тэхнічных работнікаў, якія праявілі сябе на грамадскай і вытворчай рабоце. (ТАСС).

Сёння ў Зялёным тэатры парка імені Горкага адбудзецца вечар сустрэчы працоўных горада з дэпутатамі Вярхоўнага Совета СССР, прысвечаны вынікам работы Трэцяй Сесіі Вярхоўнага Совета СССР.

Пачатак у 7 гадзін вечара.

Білеты — у горрайкомах КП(б)Б.

МЕНСКІ ГАРКОМ КП(б)Б.

У ЦК ВКП(б)

Сфарміраванне Камісіі Партыйнага Кантроля пры ЦК ВКП(б)

ЦК ВКП(б) зацвердзіў:

а) Членамі Камісіі Партыйнага Кантроля пры ЦК ВКП(б) тт. Абрамаву А. Г., Алёхіна І. Я., Алферава П. Н., Андрэева А. А., Афанасьева Н. М., Грышына І. Т., Клісеева П. П., Егорава Г. І., Ершова В. А., Захарава М. Г., Землянскага М. І., Зубыніна Л. М., Іваноўскага Г. І., Жыгалава А. К., Крукава П. С., Леонава А. П., Міронава В. Н., Орлова А. Л., Паўлава В. П., Перава Г. В., Петрова В. П., Патапава С. В., Пугаўкіна Г. Н., Стракаценка І. Н., Трафімава А. С., Федарэнка А. І., Філімонава В. Л., Фоніна М. М., Фурсова І. С., Цыплакова Б. І., Шкіратава М. Ф.;

б) Бюро Камісіі Партыйнага Кантроля пры ЦК ВКП(б) у саставе тт. Андрэева А. А. — старшыня КПК, Шкіратава М. Ф. — нам. старшыні КПК, Перава Г. В. — нам. старшыні і адказны сакратар бюро КПК, Іваноўскага Г. І.— нам. старшыні КПК, Грышына І. Т. — нам. старшыні КПК;

в) Парткалегію Камісіі Партыйнага Кантроля пры ЦК ВКП(б) у саставе тт. Андрэева А. А. — старшыня парткалегіі, Шкіратава М. Ф. — нам. старшыні парткалегіі, Перава Г. В. — нам. старшыні парткалегіі, Леонава А. П. — адказны сакратар парткалегіі, Абрамавай А. Г.—член парткалегіі.

Партыйнае жыццё

ПАРТЫЙНА-МАСАВАЯ РАБОТА НА БУДАЎНІЦТВЕ

Магілеўскі будаўнічы трэст — адна з буйнейшых арганізацый якая вядзе вялікую работу па ператварэнню Магілева ў адзін з узорных гаралоў рэспублікі. На будаўніцтве працуе вялікая колькасць рабочых. За апошні час па albору комсамольскіх арганізацый на будаўніцтва прыбыло новае папаўненне комсамольцаў.

Вялікія задачы стаяць перад калектывам будаўнікоў. Яны павінны ў тэрмін выканаць урадавае заданне — своечасова здаць у эксплаатацыю пачатае будаўніцтва.

Поспех работы будзе залежаць перш за ўсё, ад таго, наколькі партыйныя арганізацыі будаўнічых участкаў і палсобных прадпрыемстваў забяспечаць шырокае разгортванне палітыка-выхаваўчай работы. Поспехі залежаць і ад таго, як комуністы і комсамольцы забяспечваюць сваю авангардную ролю на вытворчасці, як яны ўзначальваюць сацыялістычнае спаборніцтва імені Трэцяй Сталінскай Пяцігодкі.

Партыйная праслойка на будаўніцтве невялікая. На розных участках Магбудтраста працуюць 63 комуністы, якіх аднаюць пяць пярвічных партыйных арганізацый. Трэба сказаць, што гэтыя партарганізацыі працуюць без належнага кіраўніцтва. Гарком партыі не аказвае дапамогі гэтым партыйным арганізацыям. У выніку партыйна-масавая работа знаходзіцца ў вельмі запушчаным становішчы.

Год назад на трэці ўчастак рашэннем бюро гаркома партыі быў накіраван для работы тав. Корзун. Бюро яго рэкамендавала парторгам будоўлі. Аднак яшчэ і зараз на ўчастку не аформлена пярвічная партыйная арганізацыя, хаця там і працуюць чатыры комуністы. На ўчастку працуе звыш 300 чалавек рабочых, з якімі ніякай выхаваўчай работы не праводзіцца.

Дрэнна пастаўлена палітычная работа на будучастку № 2, які аднае тры аб'екты (гасцініца, кінатэатр, школа). Сакратар пярвічнай партыйнай арганізацыі тав. Магарыл слаба звязан з комуністамі, вельмі рэдка бывае сярод рабочых, а калі і наведвае будоўлі, то толькі па пытаннях гаспадарчых, як начальнік аддзела механізацыі. Нават партыйны сход не склікаўся ўжо на працягу двух месяцаў.

На будаўнічых участках трэста часта бываюць прастоі, выбываюць са строю механізмы, дрэнна арганізавана праца, што выклікае вялікую цякучасць рабочай сілы. Аднак і гэтыя важнейшыя пытанні вытворчасці праходзяць міма ўвагі партыйнай арганізацыі; яна ўхілілася ад кантролю над вытворчасцю.

Не лепш справа і з пастаноўкай партыйнай прапаганды сярод комуністаў і непартыйных большэвікоў. Тут звычайна лічыцца, што ўсе комуністы самастойна вывучаюць «Кароткі курс гісторыі ВКП(б)». А ў сапраўднасці мала хто з членаў і кандыдатаў партыі працуе самастойна над кнігай. На 4 будаўнічым участку партарганізацыя стварыла гурток для комсамольцаў. Пяць разоў збіраліся яны на заняткі, вывучылі першы раздзел гісторыі партыі і на гэтым праца гуртка спынілася.

Рабочыя Магбудтраста жывуць, галоўным чынам, у інтэрнатах. Гэта стварае ўсе ўмовы для правядзення палітычнай агітацыі. Аднак з гэтай справай абстаіць выключна дрэнна. У інтэрнаце «Давыдаўка» жывуць 400 рабочых, якія праяўляюць вялікую цікавасць да лекцый і даклада, просяць забяспечыць іх кнігамі і журналамі. Гэта жаданне астаецца незадаволеным. Туды рэдка заглядаюць партыйныя і профсаюзныя кіраўнікі ўчасткаў. Адзіны чалавек, які больш ці менш цесна звязан з рабочымі, гэта — камендант будынка. Ён, апрача сваіх службовых функцый, часам чытае голасна газету.

Не лепш справа ў інтэрнатах «ОКС»-2, і ў пасёлку імені Чапаева.

Калектыў рабочых Магбудтраста складаецца ў большасці з навічкоў, зусім нядаўна прышоўшых з калгаснай вёскі. Сярод іх трэба весці палітычна-выхаваўчую работу, усямернымі клопатамі і ўвагай стварыць таварыскую абстаноўку, бо адсутнасць усяго гэтага цягне за сабой пякучасць і прагулы, якія маюць месца на ўчастках.

На будаўніцтве ёсць усе неабходныя ўмовы для таго, каб падняць палітыка-выхаваўчую работу на належную вышыню, і асабліва зараз, калі ў калектыў рабочых уліліся сотні комсамольцаў. Маладыя энтузіясты гараць жаданнем аддаць усе свае сілы і веды на выкананне ў тэрмін урадавага задання. У асобе комсамольцаў партыйная арганізацыя будзе мець сотні палкіх агітатараў, бяседчыкаў і чытчыкаў, якія акажуць дзейную дапамогу ў правядзенні палітычнай агітацыі. Але імі неабходна кіраваць, аказваючы ім штодзённую практычную дапамогу.

С. ЛЯСНЕЎСКІ,
А. КУЗНЯЦОЎ.

г. Магілеў.

ПА ЎСТАНОЎЛЕНАМУ ШАБЛОНУ

Перагортваючы старонкі абласной газеты «Гомельская праўда», можна ўпэўнена сказаць, што рэдактар гэтай газеты т. Фешчанка не зразумеў указанняў XVIII з'езда аб строгім, індывідуальным адборы ў партыю сапраўды перадавых людзей, бязмежна адданых справе сацыялізма. Змяненні ў статуце ВКП(б), імкненне рабочых, калгаснікаў, совецкай інтэлігенцыі ўступіць у партыю былі зразуметы як чарговая кампанія. Газета штодня пасля XVIII з'езда змяшчала заметкі аб росце ВКП(б). Усе яны напісаны сухой мовай, па ўстаноўленаму шаблону. Вялікую работу партарганізацый па росту ВКП(б) газета ўціскала ў пэўны штамп, дзе адсутнічалі свежыя мысліі, цікавыя факты і нават жывыя людзі, адсутнічала растлумачэнне, што пры прыёме ў партыю патрэбна свята захоўваць індывідуальны падыход да людзей.

Газета «Гомельская праўда», захапіўшыся колькасцю заметак, стала на няправільны шлях. У рэзультаце яна прайшла міма фактаў нарушэння статута ВКП(б) у асобных партарганізацыях вобласці, не змагла своечасова ўскрыць недахопы, выступіць супроць валавога прыёму ў партыю. Нават сама газета па некаторай ступені арыентавала партарганізацыі на спешку і кампанейшчыну.

Пасля XVIII з'езда ВКП(б) амаль у кожным нумары газеты змяшчаліся заметкі аб росце партыі. У гэтых матэрыялах адсутнічаў разгорнуты паказ людзей, уступаючых у партыю, заметкі пісаліся нібы пад капірку. Так, напрыклад, 8 красавіка газета пісала: «Лепшыя комсамольцы комсамольскай арганізацыі пры Пірэвіцкай сярэдняй школе ўступаюць у партыю». А праз два дні, 10 красавіка ў заметцы «Прыём у партыю па новаму статуту» паведамлялася: «У рэзультаце праведзенай работы ўзмацнілася цяга рабочых і інтэлігенцыі ў рады ВКП(б). У партыю ўступаюць лепшыя людзі з совецкай інтэлігенцыі».

11 красавіка газета зноў выступае з артыкулам «Вялікая цяга ў партыю». Гэта заметка нібы паўтарае папярэднюю: «У рэзультаце праведзенай палітычнай работы сярод працоўных узмацнілася цяга ў партыю лепшых людзей». Такі-ж тон газеты і ў заметцы «У партыю ўступаюць перадавыя людзі прадпрыемства», якая была змешчана 12 красавіка. Зноў паведамлялася аб вялікай пязе перадавых людзей у партыю.

Шаблон і трафарэт запоўніў і наступныя заметкі, якія змяшчала газета «Гомельская праўда» па пытанню росту партыі. Так, 24 красавіка газета выступіла з заметкай «Рост партыйных радоў». У ёй чытачы нічога новага не знайшлі. Газета зноў паведамляла, што «палітычны і вытворчы ўзлым... павялічыў цягу лепшых людзей у партыю».

У пачатку мая ў матэрыялах аб росце партыі таксама не падкрэслівалася неабходнасць захавання строгага індывідуальнага падыходу да людзей пры прыёме ў партыю, прадаўжалася падача заметак па выпрацаванай шаблоннай форме.

Змяшчаючы матэрыял аб росце партыі, газета не ўглублялася ў яго палітычны змест. Таму амаль кожная заметка перапаўнялася аднастайнымі фразамі, завучаным штампам, як-та: «лепшыя людзі ўступаюць у партыю», «лепшыя калгаснікі ўступаюць у партыю», «лепшыя пралетарыі совецкай інтэлігенцыі», «лепшыя стаханаўцы ўступаюць у рады ВКП(б)». Чытач мог загадзя здагадацца, аб чым гаворыць газета ў сваіх заметках па росту партыі.

Павярхоўнае асвятленне пытанняў, шаблон у заметках не вучылі партарганізацыі, не паказвалі сапраўды настойнага напаўнення радоў нашай партыі. У газеце мала артыкулаў партыйных кіраўнікоў. Усе змешчаныя заметкі напісаны як-бы адной рукой, па загадзя ўстаноўленай мерцы.

Толькі ў апошніх чыслах мая месяца газета нарэшце дала карэспандэнцыі аб нарушэнні прынцыпаў індывідуальнага прыёму ў партыю. На гэту тэму было змешчана два артыкулы: адзін перадавы ад 20 мая—«Строгі індывідуальны адбор пры прыёме ў партыю» і артыкул ад 24 мая—«Строга захоўваць прынцып індывідуальнага адбору ў партыю». У гэтых артыкулах газета на фоне станоўчых з'явішчаў адзначала нарушэнне статута ВКП(б). Аднак і гэтыя артыкулы мелі буйныя недахопы: перадавы абмяжоўваўся адным фактам нарушэння статута ВКП(б) у партарганізацыях вобласці, а другі артыкул змяшчаўся ў рэспубліканскім друку і на старонках «Гомельскай праўды» з'явіўся з вялікім спазненнем.

Асвятляючы пытанні росту ВКП(б), газета «Гомельская праўда» выпусціла з поля зроку галоўнае—барацьбу за захаванне статута ВКП(б), барацьбу за індывідуальны адбор перадавых людзей у рады партыі Леніна—Сталіна. Вінаць, работнікі рэдакцыі забылі ўказанні таварыша Сталіна аб неабходнасці «сістэматычна паляпшаць састаў партыі, падымаючы ўзровень свядомасці членаў партыі і прымаючы ў рады партыі ў паралку індывідуальнага адбору толькі праверапых і адданых справе комунізма таварышаў».

МЯСЦОВЫЯ РЭСУРСЫ СУРАЖСКАГА РАЁНА

СУРАЖ. (Спец. кар. «Звязды»). Сур'ёзна, дзелавіта абмяркоўвалася на раённай нарадзе гаспадарчага актыва пытанне аб скарыстанні мясцовых рэсурсаў для далейшага развіцця нізавой прамысловасці.

Дырэктары прадпрыемстваў, планавікі, кіраўнікі промарцелей, стаханаўцы расказвалі аб тых велізарных нявыкарыстаных рэзервах, якімі багат раён. Тут ёсць торф, вапна, гліна, гравій і іншыя карысныя выкапні.

Штогод райпромкамбінат расходуе на патрэбы свайго лесазавода, млына, электрастанцыі да 9 тыс. кубаметраў дроў. Дальнасць перавозак і вялікія расходы, звязаныя з загатоўкай дроў, моцна адбіваюцца на фінансавым становішчы камбіната. Значна павялічваецца сабекошт прадукцыі. Па лесапіленню, напрыклад, сабекошт павялічан да 20 проц. супроць плана, па мукамоллю — на 19,5 проц., электраэнергіі — на 4,7 проц. Між тым, літаральна за паўтара кілометра ад раённага цэнтра, у мясцовасці Брыгітполле, знаходзіцца балота, дзе можна арганізаваць здабычу торфу.

Паўднёвая частка раёна, дзе размешчаны Янавіцкі, Котаўскі, Станькінскі, Войтаўскі і іншыя сельсоветы,—бязлесная. Загатоўка дроў для школ, устаноў і патрэб насельніцтва праводзіцца за 25—30 кілометраў, у той час як на тэрыторыі Янавіцкага сельсавета ёсць вялікае торфабалота «Гладонскі мох» плошчаю ў 2.218 гектараў, з запасам торфу ў 58.170 тыс. кубаметраў. Гэты вялікі тарфяны масіў не скарыстоўваецца. Да частковай эксплаатацыі балота прыступіў толькі Янавіцкі спіртзавод. Сёлета ён намеціў здабыць 3 тыс. тон торфу, але гэта колькасць поўнасцю не задаволіць нават патрэбы самога прадпрыемства.

Вялікія торфамасівы ёсць таксама ў Пудацкім, Суражскім, Астроўскім, Курынскім і іншых сельсоветах, аднак і яны не распрацоўваюцца.

Нязмерны залежы гліны ў раёне. На тэрыторыі толькі аднаго Курынскага цагельнага завода ёсць запасы гліны ў колькасці 280.340 кубаметраў. Многа гліны ёсць таксама на тэрыторыі калгасаў «Барэц», Шаброўскага сельсавета, «Серп і молат», Марчонскага сельсавета, «Чырвоны металіст», Краўцоўскага сельсавета. Але гэтая гліна, як і торф, скарыстоўваецца вельмі недастаткова. Гадавая выпрацоўка Курынскага завода не перавышае 1 мільёна паглін. Зусім не працуе цагельня, што на тэрыторыі картоннай фабрыкі імені Вароўскага. Праўда, пэглу выпрацоўваюць некаторыя калгасы, але ў мізэрнай колькасці.

Наяўнасць вялікага запасу гліны дае магчымасць намнога павялічыць выпрацоўку цэглы і поўнасцю задаволіць растучыя патрэбнасці раёна ў будаўнічых матэрыялах.

Курынскі завод апрача выпрацоўкі цэглы можа таксама намнога павялічыць выпуск ганчарных вырабаў і разгарнуць вытворчасць чарапіцы. Станкі па выпрацоўцы чарапіцы, якія ёсць на заводзе, не скарыстоўваюцца.

Праз тэрыторыю раёна працякае рака Заходняя Дзвіна і яе прытокі Каспля, Усвяча і інш. Ёсць 12 азёр. Усё гэта спрыяе лову рыбы, які, дарэчы, не арганізован. Колькасць калгасных рыбалоўных брыгад зусім нязначная.

Выступіўшыя таварышы на нарадзе ўнеслі рад каштоўных прапаноў па дадатковаму павелічэнню выпрацоўкі прадметаў хатняга ўжытку. У прыватнасці, было ўказана, што райпромкамбінат можа арганізаваць выраб крэслаў, школьных парт, сталоў і шафаў. Арцель «Чырвоны мэбельшчык..» павінна павялічыць выраб такіх прадметаў, як сані, калёсы, бочкі і інш. Гэтыя прадметы можа выпускаць таксама лесапункт з адыходаў лесараспрацовак. Інвалідная арцель можа вырабляць валенкі. Шклозаводу «Ноўка» трэба павялічыць асартымент прадметаў шырспажыву (дзіцячыя цацкі і інш.).

Вялікую ўвагу ўдзельнікі нарады аддалі пытанню скарыстання воднай энергіі для далейшай электрыфікацыі раённага цэнтра і калгасаў. На рацэ Касплі можна пабудаваць гідраэлектрастанцыю магутнасцю ў 350—400 кіловат. Пабудовай гэтай станцыі будзе вырашана і другая праблема — ператварэнне Касплі ў суднаходную раку.

На нарадзе выявіліся вялікія магчымасці. Па-большэвіцку скарыстаўшы іх, раён зможа даць краіне вялікую колькасць прадукцыі шырокага спажывання. За гэта павінны энергічна змагацца мясцовыя партыйныя і совецкія арганізацыі.

З. ЛАРЫСАЎ,
В. ПАЛЯКОЎ.

АРМЕЙСКІЯ БОЛЬШЭВІКІ АВАЛОДВАЮЦЬ МАРКСІЗМАМ-ЛЕНІНІЗМАМ

Армейскія большэвікі часці з велізарнай цікавасцю прыступілі да глыбокага вывучэння тэорыі марксізма-ленінізма. Аб гэтым сведчыць той факт, што актыўнасць наведвання лекцый, дакладаў, тэарэтычных канферэнцый, арганізоўваемых партыйным кабінетам, значна ўзрасла. Гісторыю партыі вывучаюць усе комуністы і многія беспартыйныя таварышы.

Тт. Віктараў, Паўловіч, Рэзваў ужо вывучаюць 3 і 4 раздзелы гісторыі ВКП(б). Тав. Віктараў спачатку чытае ўвесь раздзел і знаёміцца з дадатковым матэрыялам, потым чытае яго паўторна і робіць у сшытку запісы. Адзначаючы галоўныя пытанні, чытаючы ў трэці раз раздзел гісторыі партыі, ён складае канспект. У дапаўненне да падручніка гісторыі ВКП(б) т. Віктараў прачытаў працы Леніна — «Што такое «прыяцелі народа?», «Што рабіць?».

Тав. Рэзваў вывучае гісторыю ВКП(б) іншым метадам. Спачатку ён чытае раздзел і робіць адзнакі ў кнізе, а пасля паўторнага чытання складае канспект. Ён таксама вывучае працы Леніна—Сталіна.

Вялікую дапамогу ў самастойным вывучэнні аказвае комуністам партыйны кабінет. У парткабінеце прачытана 13 лекцый па гісторыі ВКП(б), па матэрыялах XVIII з'езда ВКП(б) 5 лекцый. Па трох раздзелах Кароткага курса праведзены тры тэарэтычныя канферэнцыі.

Апрача арганізуемых лекцый, аказвалася дапамога вывучаючым гісторыю ВКП(б) шляхам індывідуальных гутарак і кансультацый, таварыскіх дыскусій, правядзімых у падраздзяленнях.

С. КУЦАЕЎ.

СХОД АБАРОННАГА АКТЫВА БАБРУЙСКА

БАБРУЙСК, 5 чэрвеня. Каля 500 чалавек прыняла ўдзел у сходзе абароннага актыва горада, які адбыўся 4 чэрвеня.

Па дакладу аб міжнародным становішчы і задачах абаронных арганізацый горада разгарнуліся ажыўленыя спрэчкі. Выступаўшыя расказвалі аб вопыце абароннай работы на прадпрыемствах, крытыкавалі недахопы ў рабоце горсовета Асоавіяхіма і райкома Чырвонага крыжа.

Хатняя гаспадыня тав. Гарадзецкая і рад іншых таварышоў звярнулі ўвагу на неабходнасць рашучага ўмацавання палітвыхаваўчай работы сярод жанчын.

У прынятым рашэнні сход абароннага актыва абавязаў горсовет Асоавіяхіма палепшыць кіраўніцтва низавымі асоавіяхімаўскімі арганізацыямі, сістэматычна арганізоўваць лекцыі і гутаркі на абаронныя тэмы, аб гісторыі і жыцці Чырвонай Арміі, дапамагчы прадпрыемствам і ўстановам у падрыхтоўцы да прызыва ў РСЧА.

(БЕЛТА)

ПЕРШЫЯ ВЫНІКІ РАБОТЫ МЕНСКАГА ЛЕКТАРСКАГА БЮРО

У Менску пры гаркоме КП(б)Б створана абласное і гарадское лектарскае бюро. Яно аб'ядноўвае лепшыя прапагандысцкія сілы горада. З 10 мая гэтага года лектарамі прачытана ўжо ў горадзе, раёне і на прадпрыемствах 61 лекцыя. З іх па міжнароднаму становішчу—28, па матэрыялах XVIII з'езда ВКП(б) — 19, па гісторыі ВКП(б)—7, па літаратуры—5 і т. д.

Менскае лектарскае бюро арганізавала сувязь з маскоўскім лектарскім бюро, і кожную пяцідзёнку будуць чытаць лекцыі і даклады высокакваліфікаваныя прапагандысты з Масквы.

Так, у чэрвені будуць прачытаны даклады па літаратуры, аб беспасадачным пералёце СССР—ЗША тт. Кокінакі і Гардзіенка, лекцыя «Фронт і тыл у сучаснай вайне», даклад аб міжнародным становішчы і інш. Усяго будзе прачытана 200 дакладаў і лекцый.

Лектарскае бюро па запросу любой арганізацыі горада, раёна, прадпрыемства і ўстановы можа забяспечыць лектарам або дакладчыкам на розныя тэмы. Змяшчаецца лектарскае бюро ў г. Менску, у Доме партактыва (вуліца К. Маркса, тэл. № 25-533).

А. ПРАКОПЕНКА,
загадчык вучэбнай часткі лектарскага бюро.

ПОЎНАСЦЮ САБРАЦЬ ПАЗЫКОВЫЯ ЎЗНОСЫ НА ВЁСЦЫ

Працоўныя Совецкай Беларусі, разам з усімі працоўнымі Совецкага Саюза, з вялікім уздымам падпісаліся на пазыку трэцяй пяцігодкі (выпуск першага года). У БССР на 1 чэрвеня ад рэалізацыі пазыкі паступіла 125.992 тыс. рублёў, што значна перавышае суму паступленняў мінулага года. Кіруючыя арганізацыі раду раёнаў (Талачынскі, Глускі, Плешчаніцкі, Веткаўскі, Смалявіцкі) па-большэвіцку ўзначалілі вялікую актыўнасць і ўздым калгасных мас у справе поўнай аплаты падпіскі на пазыку. Аршанскі, Гомельскі і іншыя раёны таксама паспяхова завяршаюць збор узносаў.

Аднак у многіх раёнах, сельсоветах і калгасах рэспублікі ёсць значная запазычанасць па аплаце падпіскі. Ва Уравіцкім раёне ўся падпіска пакрыта грашовымі ўзносамі толькі на 65,4 проц., у Чырвона-Слабодскім раёне—на 67,2, у Любаньскім раёне—на 62,1, у Клічаўскім—на 61,2 проц.

У Жлобінскім раёне (заг. райфа тав. Кавалеўскі, заг. ашчадкасы тав. Шышаў) у апошні час зусім спынена работа па збору пазыковых узносаў, не праводзіцца ніякага інструктажа низавых камсоладаў і ўпаўнаважаных па падпісцы. У рэзультаце запазычанасць па аплаце падпіскі ў раёне складае 52 тысячы рублёў. Яшчэ горш справа ў Халопеніцкім і Чэрвеньскім раёнах.

У сельсоветах, дзе збор узносаў поўнасцю яшчэ не закончан, гэта пытанне павінна быць абмяркована на пленуме сельсавета, дзе трэба заслухаць справаздачы ўпаўнаважаных сельсавета па збору пазыковых узносаў. Неабходна правесці такія мерапрыемствы, як суцэльную праверку выйгрышаў і выязныя пасяджэнні райкамсоладаў у сельсоветах з заслухоўваннем справаздач старшынь низавых камсоладаў.

Побач з завяршэннем збору ўзносаў па падпісцы трэба арганізаваць продаж аблігацый за наяўны разлік сярод калгаснікаў і сялян-аднаасобнікаў, якія не былі ахоплены падпіскай на пазыку.

Важнейшае значэнне мае поўнае ўручэнне аплачаных аблігацый падпісчыкам. На 1 чэрвеня па БССР выдана аблігацый ашчадкасамі калектывам рабочых і служачых і фінагентам на суму 125.412 тыс. рублёў.

Задача зараз заключаецца ў тым, каб сіламі фінактыва і работнікаў фінансава-ашчаднага апарата арганізаваць суцэльную праверку ўручэння аблігацый падпісчыкам на прадпрыемствах, ва ўстановах і сельсоветах. Гэта забяспечыць усім падпісчыкам удзел у першым тыражы выйгрышаў пазыкі трэцяй пяцігодкі (выпуск першага года), які адбудзецца 17 — 18 чэрвеня ў г. Сталіно (УССР).

Г. Н. КАТЛЯРОЎ,
нам. наркома фінансаў БССР.

РЭСПУБЛІКАНСКАЯ ШКОЛА СНАЙПЕРАЎ

З чэрвеня ў лагеры пачала сваю работу рэспубліканская школа снайпераў Цэнтральнага Совета Асоавіяхіма БССР. Сярод курсантаў—знатныя людзі прадпрыемстваў і ўстаноў розных гарадоў рэспублікі, аўладаўшыя без адрыву ад вытворчасці майстэрствам меткага агню. Тут займаюцца токар бабруйскага фанернага завода імені Кірава Абрам Бранд, хлебапёк другой віцебскай пякарні тав. Лук'янаў, рахункавод віцебскай фабрыкі імені Клары Цэткін тав. Мягкая і іншыя.

Курсанты замацоўюць у школе свае тэарэтычныя веды, навучаюцца па-снайпераску страляць у любых умовах.

У лагеры абсталявана выдатнае стрэльбішча. На сотні метраў раскінуліся бліндажы і снайперскія гнёзды. Устаноўлены спецыяльныя мішэні, якія будуць паяўляцца і адразу-ж знікаць. (БЕЛТА).

НАРОДНЫ ГЕНІЙ

(140 год з дня нараджэння А. С. Пушкіна)

У развіцці рускай літаратуры Пушкін ажыццявіў сапраўды рэволюцыйны пераварот. Пушкін з'явіўся стваральнікам рускай літаратурнай мовы, асноваположнікам, роданачальнікам новай рускай літаратуры.

Ад Пушкіна, пісаў Белінскі, мы «вядзем рускую паэзію і называем яго першым рускім паэтам. Гэта зусім не значыць, каб да яго не было паэтаў, і прытым яшчэ дастойных увагі, пашаны, любві, вядомасці і славы; але значыць толькі, што ў іх выразіліся пастуловыя намаганні рускай паэзіі, пачынаючы ад Кантэміра і Ламаносава — з штучнай і падражацельнай зрабіцца натуральнай і самабытнай, імкненне з кніжнай зрабіцца жывою, грамадскаю, зблізіцца з жыццём і грамадствам; а ў Пушкіне выразіліся таржаство і перамога гэтых намаганняў і імкненняў». У гэтых адносінах Пушкін з'явіўся для рускага народа тым-жа, чым Дантэ для Італіі, Шэкспір для Англіі, Гётэ для Германіі.

У звароце да народу — да народных казак і песень, да народнай мовы — бачыць Пушкін крыніцу той сілы, якая стварыць магутную народную літаратуру. Пушкін чулым вухам услухоўваецца ў народную мову, запісвае казкі, вывучае мову летапісаў і «Слово о полку Игореве», прагна ўпітвае багацці народнай мовы, народнай творчасці.

Да Пушкіна наша кніжная мова развівалася пад уплывам рознародных замежных моў. Яна жыла ў штучным аддаленні ад «простамоўнасці». Да Пушкіна кніжная літаратура існавала ў баку ад вуснай народнай паэзіі. У творчасці Пушкіна зліліся ў адно кніжны і народны «патокі», роўна як і ў створанай ім літаратурнай мове арганічна зліліся лепшыя элементы пісьмовай, кніжнай мовы і жывая народная мова.

У чым народнасць пушкінскага генія? Не толькі ў тым, што ён черпаў багацці мовы і вобразаў з скарбніцы народнай творчасці: Пушкін увасабіў у сабе дух народа, паказаў яго багатырскую сілу, багацце яго жыцця, яго мінулае і сучаснае. Народ, яго характар, мова, творчасць — вось тая глеба, па якой расквітнеў паэтычны геній Пушкіна.

Як жыва і верна адчуваў Пушкін гістарычнае мінулае свайго народа! З найвялікшым мастацкім пранікненнем раскрыў ён трагедыю народа ў дні польскай інтэрвенцыі і ліхалецця. Ён чуў стук тапара і гром гармат, узвяшчаўшых веліч справы Петра — прабуджэнне Русі, умапаванне яе адзінства. У Спепане Разіне бачыў ён вобраз народнага свабодалюб'я — «самы паэтычны твар нашай гісторыі».

Суровую мужнасць Пугачова, радзішчаўскую нянавісць да рабства, ідэі і начуцці дзекабрыстаў, народныя мары аб свабодзе і шчасці, раздолле і размах народнага характару — усё ўпітаў у сябе мудры геній Пушкіна, успрыняў са старонак летапісаў, узяў у жывой сувязі з народам, у яго былінах, казках, пагаворках, песнях.

Новая руская літаратура вырастала на нацыянальнай глебе, але ў цеснай сувязі з сусветнай літаратурай. Пушкінскі геній сплавіў у адно народнасць, рускія нацыянальныя рысы і дасягненні нацыянальных літаратур Захада, багацці антычнага свету, ідэі еўрапейскай асветы.

Ад Пушкіна «як свечкі ад агню», запаліліся не толькі паэты пушкінскай плеяды. «Гэты геніяльны чалавек, — пісаў аб Пушкіне Горкі, — на працягу кароткага жыцця свайго паклаў непахісныя аснаванні ўсяму, што наслеавана за ім у галіне рускага мастацтва. Без Пушкіна былі-б доўга немагчымы Гогаль... Леў Талстой, Тургенеў, Дастаеўскі. Усе гэтыя вялікія людзі Расіі прызнавалі Пушкіна сваім духоўным роданачальнікам».

Сонца пушкінскага генія сагрэла сваімі праменямі і ўсе астатнія галіны рускага мастацтва — музыку, жывапіс, тэатр. Ад яго зыходзяць рэалістычныя напрамкі для ўсіх радоў мастацкай творчасці. На творах Пушкіна ўзбагачаецца, развіваецца і сучасная совецкая літаратура, совецкае мастацтва.

Ад Пушкіна вядзе сваю радаслоўную руская дэмакратычная культура, якую пачалі стварэць і развівалі Белінскі і Чэрнышэўскі, Некрасаў і Шчэдрын. Ад Пушкіна вядзе свой пачатак благародная традыцыя рускай мастацкай літаратуры, як літаратуры глыбока ідэйнай, прасякнутай любоўю да народа, якая змагаецца за яго вызваленне.

З захапленнем і здзіўленнем глядзім мы на жыццёвы подвіг Пушкіна: які благароднейшы ўзор мужнасці і мудрасці! Нельга не памятаць, што ўсё жыццё паэта прайшло ў цяжкія, страшныя для Расіі годы, калі цяжка было дыхаць, калі гаспадарылі бесы нікалаеўскай рэакцыі, калі давіла жандармская ляспатыя. Нам, людзям іншай — свабоднай, сацыялістычнай эпохі, немагчыма нават уявіць сабе ўвесь жах царства бізуна і сваволля, ціскі нянавісці і злобы, забойчую ганьбу гаспадарання «злых без ума, без гордости спесивых...» Сярод іх вымушан быў жыць Пушкін. І не толькі жыць, але тварыць, адстойваючы ў знясільваючай барацьбе самую магчымасць творчасці. Мужна і смела, не гледзячы ні на якія перашкоды, ажыццяўляў ён тую задачу, гістарычнае значэнне якой было тады зусім ясна, бадай, толькі яму самому, стаяўшаму вышэй свайго века, вышэй усіх сваіх сучаснікаў.

Пушкін любіў народ, любіў сваю радзіму высокай, неўгаснай, палкай любоўю. Пушкін бачыў краіну, яе гісторыю, свой народ такімі, якімі яны ёсць. Ён бачыў і перажыткі варварства, і «рабства тошее», і мерзасць рэакцыйнага гнёту, і многія крывавыя і ганебныя старонкі рускай гісторыі. Але ўсё гэта не засланяла ад яго галоўнага — велічы і магутнасці народа, высокага прызначэння роднай краіны... Толькі іншаземцу даравальна не любіць ні рускіх, ні Расіі, ні гісторыі яе, ні славы яе — пісаў Пушкін... Ён гаварыў: ні за што не хацеў-бы я ні прамяняць сваю радзіму, ні мець другую гісторыю, чым гісторыя маіх продкаў.

Для многіх сучаснікаў Пушкіна паняцце «радзіма» абмяжоўвалася толькі тэрыторыяй маёнтка. Пушкінскі патрыятызм — гэта перш за ўсё палкае жаданне карысці роднаму народу, прага пазнаць яго лёс, павярнуць яго на шлях працвітання, свабоды і славы. Пушкінскі патрыятызм — гэта такі-ж патрыятызм, які быў уласцівы Белінскаму і Герцэну, Дабралюбаву і Чэрнышэўскаму.

Вобразы радзімы, яе гісторыі, яе жыцця і прыроды, вобразы, прасякнутыя мудрай пушкінскай любоўю, жывуць у яго творчай спадчыне — у паэме «Палтава» і ў «Медном всаднике», у гістарычнай трагедыі «Борис Годунов» і ў рамане «Евгений Онегин», у бяссмертных пушкінскіх казках і вершах. А. М. Горкі глыбока верна сказаў, што творы Пушкіна — гэта «геніяльныя ілюстрацыі да рускай гісторыі».

У чым бачыў Пушкін будучае высокае прызначэнне краіны?

«Товарищ, верь: взойдет она,
Звезда пленительного счастья,
Россия вспрянет ото сна,
И на обломках самовластья
Напишут наши имена!»

Так прароцка адкрывалася Пушкіну свабодная і слаўная будучыня рускага народа, нашай многанацыянальнай краіны.

Совецкая краіна, народы СССР бачаць у Пушкіне тую магутную крыніцу, адкуль пачалася вялікая і выдатная перадавая руская літаратура, якая жывым патокам уліваецца ў нашу сучаснасць, у сталінскую эпоху, сацыялістычнае сёння. Мы бачым у ім слаўнага прашчура нашай совецкай сацыялістычнай інтэлігенцыі, якая выйшла з народа і кроўна звязана з народам.

Д. А. КАРЫХАЛАЎ.

ГРАМАДСКАЯ ЗЯМЛЯ КАЛГАСАЎ СВЯШЧЭННА І НЕДАТЫКАЛЬНА

★ ★ ★

У ЧАКАННІ ДЫРЭКТЫЎ

УВАРАВІЧЫ. (Кар. «Звязды»). З вялікім уздымам сустрэлі калгаснікі раёна гістарычную пастанову ЦК ВКП(б) і СНК СССР «Аб мерах аховы грамадскіх зямель калгасаў ад разбазарвання». На сходах і мітынгах яны выказваюць сваю любоў і ўдзячнасць большэвіцкай партыі і таварышу Сталіну за праяўленыя бацькаўскія клопаты аб калгасным сялянстве.

Пасля апублікавання пастановы партыі і ўрада ў большасці калгасаў раёна рэзка палепшылася працоўная дысцыпліна.

У сельгасарцелі імені Будзённага раней на работу выходзіла ўсяго толькі 16 жанчын. Пасля апублікавання пастановы партыі і ўрада штодзенна на работу выходзяць амаль усе калгаснікі.

У калгасах Уваравіцкага раёна, як і ў іншых раёнах Гомельскай вобласці, мелі месца грубыя парушэнні статута сельскагаспадарчай арцелі. Свяшчэнную, недатыкальную калгасную зямлю растранжырвалі направа і налева. Не вялася барацьба з ілжэкалгаснікамі. Аднак і цяпер, пасля апублікавання пастановы ЦК ВКП(б) і СНК СССР, у раёне не спяшаюцца выпраўляць дапушчаныя парушэнні статута сельскагаспадарчай арцелі. Сакратар райкома партыі тав. Кільбін заяўляе:

— Мы пакуль-што абмяжоўваемся прапагандыраваннем пастановы партыі і ўрада. А аб практычных мерапрыемствах па правядзенню ў жыццё гэтай пастановы чакаем далатковых дырэктыў.

А тым часам, пакуль райком партыі чакае дырэктыў, у калгасах раёна прадаўжаецца разбазарванне калгаснай зямлі. Вось факты. У гар. пасёлку Уваравічы ёсць калгас «Прасвет». Гэты калгас «праславіўся» наяўнасцю многіх ілжэкалгаснікаў. Гэта выклікае нястачу рабочай сілы. У 1938 годзе калгас эрасходаваў на наём рабочай сілы 10 тысяч рублёў. За перыяд вясенне-пасеўнай кампаніі гэтага года эрасходавана каля двух тысяч рублёў.

Пад відам прысядзібных участкаў праўленне калгаса разбазарыла 30 гектараў калгаснай зямлі. Характэрна, што сядзібы звыш 0,60 гектара атрымалі ў першую чаргу тыя калгаснікі, якія выпрацавалі не больш 10—15 працадзён.

Факты разбазарвання калгаснай зямлі маюць месца і ў іншых калгасах. Зусім нядаўна прэзідыум райвыканкома (старшыня т. Караткевіч) вынес рашэнне аб адрэзцы ад калгаса імені Куйбышэва 15 гектараў зямлі для пабудовы дамоў рабочым станцыі Уза.

Старшыня калгаса «Авангард» т. Шэкланаў распараджаецца калгаснай зямлёй, як сваімі ўласнымі рэчамі. Без ведама праўлення Шэкланаў здаў у арэнду 5 гектараў сенажаці рабочым Будзішчанскай МТС. Шоферу Ольхаваму шчодры старшыня адпусціў 0,70 гектара сенажаці. Калгасу «Дняпровец» прадаў 8 гектараў калгаснай зямлі. У гэтым калгасе многія сем'і калгаснікаў, як Нікалая Музычонка, Кузьмы Мац'янава і інш., карыстаюцца двума прысядзібнымі ўчасткамі.

У раёне маюць месца факты самавольнага захвату калгаснай зямлі. У калгасе імені Кірава аднаасобнікі захвацілі многа калгаснай зямлі, а суддзя тав. Ешчына абмежаваўся толькі тым, што аштрафаваў нарушыцеляў па 50 рублёў. Большасць аднаасобнікаў раёна маюць па 5 і больш гектараў зямлі.

Пастанова ЦК ВКП(б) і Соўнаркома СССР «Аб мерах аховы грамадскіх зямель калгасаў ад разбазарвання» клаўзе канец парушэнням статута сельгасарцелі. Чэсныя калгаснікі Уваравіцкага раёна маюць поўнае права чакаць ад раённых кіруючых арганізацый самага хуткага правядзення ў жыццё гэтай гістарычнай сталінскай пастановы.

Н. ГІРШЫН.

Першая праполка ільну ў калгасе імені Леніна, Гомельскага раёна.
Фото А. Р. Шаевіча. (Фотахроніка БЕЛТА).

ПАВЫСІЛАСЯ ПРАЦОЎНАЯ ДЫСЦЫПЛІНА

МСЦІСЛАЎЛЬ. Калгаснікі раёна з ажыўленым адабрэннем сустрэлі пастанову ЦК ВКП(б) і СНК СССР «Аб мерах аховы грамадскіх зямель калгасаў ад разбазарвання». Райком КП(б)Б накіраваў у калгасы раённы партыйны актыў для дапамогі калгасам у вывучэнні і ажыццяўленні гэтай гістарычнай пастановы.

Ва ўсіх калгасах раёна адбыліся многалюдныя сходы, на якіх калгаснікі ад усёй душы віталі мудрую сталінскую пастанову. Пастанова партыі і ўрада зараз праводзіцца ў жыццё. У калгасах «Прагрэс», «Вольная праца» і «Чырвоны Кастрычнік», Пячкавіцкага сельсавета, пры абмерванні сядзіб выяўлена, што 25 калгаснікаў мелі павышаныя нормы сядзіб. Лішкі адрэзаюцца. У калгасніка Пятра Сямёнава адрэзана лішняй зямлі 0,30 гектара, у Ягора Ткачова і Змітрака Валюжавіча — па 0,12—0,15 гектара і інш.

Пастанова садзейнічае ўзняццю працоўнай дысцыпліны ў калгасах раёна. Вось, напрыклад, калгас імені Кірава, Татаршчынскага сельсавета. З прычыны многіх нявыхадаў на работу калгасу прыходзілася карыстацца наёмнай рабочай сілай, псавалася калгаснае дабро, таму што спазняліся з уборачнымі работамі. У апошнія дні ў калгасе рэзка павысілася працоўная дысцыпліна. Многія калгаснікі, якія раней прагульвалі, цяпер акуратна выходзяць на работу.

В. ПЫЖКОЎ.
Ф. ПАТАПЕЙКА.

ВЫПРАЎЛЯЮЦЬ ДАПУШЧАНЫЯ НАРУШЭННІ СТАТУТА

ЖЛОБІН, 5 чэрвеня. (БЕЛТА). Пасля апублікавання пастановы ЦК ВКП(б) і СНК СССР «Аб мерах аховы грамадскіх зямель калгасаў ад разбазарвання» ва ўсіх калгасах раёна разгорнута работа па прывядзенню ў парадак прысядзібных участкаў, якія ў радзе месц былі незаконна разлуты.

Гаспадарка брыгадзіра калгаса «Яскравы шлях» Івана Хадарэнкі карысталася трыма прысядзібнымі ўчасткамі. Гэта рэзультат фіктыўнага раздзелу сям'і. Дарэчы, сёстры Хадарэнкі, для якіх былі адведзены два ўчасткі (хоць яны жылі ў адной сям'і), на калгасную працу ніколі не выходзілі. Кіруючыя пастановай ЦК ВКП(б) і СНК СССР, калгаснікі адвялі сям'і Хадарэнкі адзін прысядзібны ўчастак.

У гэтым-жа калгасе незаконна карысталася трыма прысядзібнымі ўчасткамі гаспадарка Козыравых. Гэтае парушэнне статута таксама выпраўлена.

Разгорнута работа па прывядзенню ў парадак прысядзібных участкаў і звароту калгасам разбазараных зямель у Акцябрскім, Бабоўскім, Малевіцкім і інш. сельсаветах.

Пастанова ЦК ВКП(б) і СНК СССР садзейнічае ўмацаванню працоўнай дысцыпліны ў калгасах. Абмеркаванне пастановы амаль паўсямесна суправаджаецца прыёмам аднаасобнікаў у калгасы. У сельскагаспадарчую арцель «Чырвоны рубеж» уступіла 6 аднаасобных гаспадарак, у калгас «Яскравы шлях» — 3 гаспадаркі і т. д.

***

КЛІМАВІЧЫ, 5 чэрвеня. (БЕЛТА). З вялікай актыўнасцю вывучаюць калгаснікі раёна пастанову ЦК ВКП(б) і СНК СССР «Аб мерах аховы грамадскіх зямель калгасаў ад разбазарвання».

Разам з вывучэннем пастановы праводзіцца практычная работа па выпраўленню парушэнняў статута сельгасарцелі. Праходзіць абмер і абрэзка разлутых прысядзібных участкаў. Адмяжоўваюцца сядзібы калгасаў ад агульных масіваў калгаснай зямлі.

Аднак, асобныя старшыні калгасаў і сельсоветаў яшчэ марудна выпраўляюць дапушчаныя імі грубыя парушэнні статута сельскагаспадарчай арцелі. У калгасе «Чырвоная паляна» яшчэ і зараз калгаснай зямлёй карыстаюцца пастаўнікі не члены калгаса.

ПОЛЕ ШУМІЦЬ УРАДЖАЕМ

За вёскай, дзе на ўзгорку павольна ўзмахвае крыллямі вятрак, як акінуць вокам, ляжыць цёмназялёны лыван пасеваў. Хвалюецца на ветры закаласаваўшае жыта, лапушыцца канюшына, цягнуцца ўгору авёс, ячмень, лён. Толькі мясцамі гэты цудоўны жывы дыван прарываецца лапінамі шэрацёмнай зямлі. Гэта палі, засеяныя бульбай. Удалечы, на зялёным фоне ярка вызяляюцца рознаколерныя плашчі жанчын-калгасніц, якія выйшлі палоць свае ўчасткі. Бясконцаю стужкаю праразае пасевы дарога. Пахі зямлі і расліннасці, своеасаблівы піхі шум палёў, сагрэтых сонцам і напоеных дажджамі, ўзвышаюць настрой, напаўняюць сэрца невыказнаю радасцю і вясёласцю.

Асабліва вяліка гэтая радасць у таго, хто засяваў гэтыя палі, в любоўю ўкладаў у іх многа працы і стараннасці і зараз бачыць, як па-гаспадарску апрацаваная і ўгноеная зямля здзяйсняе яго надзеі і імкненні.

— Добры ўраджай будзе,—схіліўшыся над густым кучаравым ільном, з лёзь блукаючай на твары ўсмешкай, гаворыць звеннявая, не вельмі даўно ўзнагароджаная ордэнам Леніна, Анастасія Грыгор'еўна Ціткова.

Звеннявой Анастасія Ціткова працуе пяты год. У яе накоплен багаты вопыт па атрыманню высокіх ураджаяў. У 1936 годзе яна сабрала з гектара 523 цнт. бульбы, у 1937 годзе—600 цнт., у 1938 засушлівым годзе было сабрана 473 цнт. бульбы і 7 цнт. ільнавалакна з гектара. За атрыманне высокіх ураджаяў яна залічана ўдзельнікам Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі.

Але ўсе гэтыя годы за яе звяном замацоўвалася на невялікай плошчы толькі адна—адзе культуры. На працягу лета звяно не было загружана работай. У гэтым годзе ў калгасе арганізавалі камбінаваныя звенні, за імі замацаваны амаль усе яравыя пасевы. За звяном Ціткоўай, у якое ўваходзяць 7 жанчын і 3 мужчыны, замацавана 5 гектараў бульбы, 1,5 гектара ільну, 3 гектары аўса, 2 гектары ячменю і іншыя культуры. Змагаючыся за высокі ўраджай на ўсёй плошчы пасева, звяно выдзеліла асобна 1 гектар бульбы і 1 гектар ільну для дасягнення рэкордна ўраджаю.

Вось і зараз Анастасія Грыгор'еўна аглядае лён, дзе звяно змагаецца за атрыманне не менш 10 цнт. ільнавалакна з гектара.

— Бачыце, што дае мульчыраванне пасеваў ільну тарфяной крошкай,—паказваючы на два суседнія ўчасткі, якія засяваліся ў адзін і той-жа дзень, але па росту ільну яны рэзка адрозніваюцца адзін ад другога, гаворыць Ціткова.—А як неахвотна ішлі нашы калгаснікі на гэтую справу. Зараз ім не трэба ўжо даказваць вялікай карысці, якую прыносіць мульчыраванне.

Яна расказвае, як, захоўваючы ўсе правілы агратэхнікі, звяно праводзіла апрацоўку глебы і сяўбу. На рэкордны гектар пад лён было ўнесена 5 цэнтнераў фасфарытнай мукі, 4 цэнтнеры калійнай солі, 1,5 цнт. монтан-селітры. Адразу-ж пасля сяўбы было праведзена мульчыраванне тарфяной крошкай. Пасля першай праполкі падкормка пасеваў робіцца птушыным памётам. Лён расце густы, цёмназялёны.

Тут-жа недалёка — рэкордны гектар бульбы, з якога звяно абавязалася сабраць не менш 500 цэнтнераў. Бульба пасеяна пад маркер адлегласцю каліва ад каліва на 60 сантыметраў. На гектар было вывезена 195 вазоў гною і ўнесена 8 цнт. попелу. Першы раз баранаванне бульбы праведзена. Баранаваюць яна будзе яшчэ і ў другі раз. Потым—праполка і трохразовае акучванне. Сяўба бульбы пад маркер дае магчымасць акучванне рабіць шахматным парадкам. Кожнае каліва бульбы акучваецца з чатырох бакоў.

Аглядаючы свае пасевы, Анастасія Ціткова абавязкова заглядвае і на пасевы звяна Анастасіі Арловай.

— Спаборнічаем мы з ёю, дык вось для цікавасці і заглянеш, а мо' у яе лепшы лён ідзе...—прызнаецца яна. У мінулым годзе Арлова была ў звяне Ціткоўай. У гэтую вясну яна самастойна ўзяла звяно і змагаецца зараз за атрыманне такога-ж высокага ўраджаю, заваёўвае права ўдзелу на Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы. Спаборніцтва звенняў за першынства вельмі напружанае. Яны не жадаюць адно другому ўступіць у чым-небудзь. Раз звяно Ціткоўай праводзіць якое-небудзь новае аграмерапрыемства, то абавязкова правядзе яго і звяно Арловай.

Разам з такімі перадавымі звеннямі у калгасе ёсць і такія звенні, як звяно Дуні Хропавай, якія ўсё яшчэ дрэнна арганізоўваюць сваю працу. Брыгадзіры і праўленне калгаса адрываюць калгаснік перадавых звенняў для догляду пасеваў на ўчастках адстаючых звенняў.

— Па праўдзе кажучы,—гаворыць далей Ціткова, — работа гэтых звенняў арганізавана дрэнна толькі таму, што камплектаванне іх правялі фармальна, што ў іх многа запісалася лодыраў, якія меркавалі схавацца за плячмі сумленных калгаснік і калгаснікаў. Але зараз гэта не выйдзе. Пастанова партыі і ўрада аб мерах аховы зямель калгасаў пакладзе гэтаму канец.

... Навокал хвалюецца каласістае збожжа, падрастае ярына, прабіваецца з пухкай зямлі бульба. Калгаснае поле шуміць багатым сталінскім ураджаем!

НІК. ВІШНЕЎСКІ.
Калгас «Камінтэрн», Чачэрскі раён.

ЗА 60 ТЫСЯЧ ТОРФАЦАГЛІН У ЗМЕНУ НА КОЖНЫМ СКРЭПЕРЫ!

СПАБОРНІЦТВА ТАРФЯНІКАЎ УКРАІНЫ І БЕЛАРУСІ

У пачатку сезона рабочыя тарфяных прадпрыемстваў Беларусі заключылі сацыялістычны дагавор з тарфяникамі Украінскай рэспублікі на датэрміновае выкананне плана торфаздабычы 1939 года.

Учора рэдакцыя газеты «Звязда» звязалася па тэлефону з Украінскім трэстам тарфяной прамысловасці. Галоўны інжынер трэста Александр Петровіч Мельнікаў паведаміў нам:

— Сёлета тарфяныя заводы Украіны павінны даць сацыялістычнай прамысловасці 812 тысяч тон торфу,—на 144 тысячы тон больш чым у мінулым годзе. На 1 чэрвеня ўжо здабыта 199 тысяч тон — 83,6 проц. каляндарнага плана. На тарфяных палях працуе 58 машын (элеватарныя і скрэперныя ўстаноўкі, багеры).

Буйнейшы торфзавод — Ірдынскі — з першых-жа дзён сезона сістэматычна перавыконвае свой план. Прадпрыемства штодзённа здабывае звыш 1 мільёна торфацаглін — 114—116 проц. задання.

Скрэперны парк трэста папоўніўся ў гэтым годзе 15 новымі машынамі. Усе брыгады, якія працуюць на скрэперах, значна перавыконваюць свае нормы.

Знатны тарфянік Украіны брыгадзір скрэпернай устаноўкі Масцвянскага завода Кіеўскай вобласці тав. Кандрашчук дабіўся выдатнага рэкорда, здабыўшы за змену 102 тысячы торфацаглін — 200 проц. нормы. Майскае заданне яго брыгадай выканана на 125 проц. У сярэднім яна дае за змену 60—65 тысяч торфацаглін.

Брыгады Усцянскага завода тт. Баклая, Рудэнкі, Купэнкі здабываюць па 53—54 тысячы торфацаглін.

Тарфянікі Украіны энергічна змагаюцца за заваяванне пяршынства ў сацыялістычным спаборніцтве з тарфянікамі брацкай Беларускай рэспублікі.

МОЙ ВОПЫТ РАБОТЫ

У гэтым годзе на нашым заводзе «Шлях сацыялізма» ўпершыню пушчаны ў эксплаатацыю складанейшыя тарфяныя машыны — скрэперы. Механізацыя торфаздабычы значна аблегчыла работу тарфянікаў. Элеватарную машыну абслугоўвае 33 чалавекі, а скрэпер—толькі 17.

Пры дапамозе тэхнічнага дырэктара тав. Гулякевіча і галоўнага механіка тав. Лабяка мы быстра асвоілі новую машыну. На-хаду знішчылі тэхнічныя непаладкі, замянілі ўсе нягодныя дэталі. Праз 6 дзён пасля пуску скрэпера брыгада пачала ўжо выконваць норму, здабываючы за змену па 38.000 торфацаглін.

З кожным днём расла наша выпрацоўка. 31 мая мы дабіліся рэкорднай выпрацоўкі, даўшы за змену 88.300 торфацаглін — 232 проц. нормы.

Як мы гэтага дасягнулі? Асноўная ўвага была звернута на правільную арганізацыю працы ў брыгадзе. Кожны тарфянік дасканала вывучыў скрэпер. Прастоі зусім ліквідаваны. Працоўная дысцыпліна ў брыгадзе знаходзіцца на высокім узроўні. У нас няма ні прагулаў, ні спазненняў. Дружна, згуртавана працуе наш невялічкі калектыў. Ні адна мінута не прападае даремна.

Скрэпероўшчык т. Коваль добра спраўляецца з кіраваннем машыны. Выдатна працуюць спільшчыкі тт. Смальцэр і Крысенка Міхаіл; яны выконваюць норму на 175 проц.

Стаханаўскую работу брыгады забяспечыла таксама добра наладжаная культурна-масавая работа сярод тарфянікаў. Прафорг тав. Сяргейчук сістэматычна праводзіць чыткі газет і гутаркі.

Вопыт работы нашай брыгады паказвае, што пры добрым асваенні механізмаў і правільнай арганізацыі працы ўсе брыгады, якія працуюць на скрэперах, могуць свабодна даваць за змену па 60.000 торфацаглін.

Уключыўшыся ў сацыялістычнае спаборніцтва імені Трэцяй Сталінскай Пяцігодкі, наша брыгада абавязалася скончыць сезоннае заданне па торфаздабычы да 11 ліпеня — дня вызвалення Беларусі ад белапольскіх акупантаў. Сваё абавязацельства мы выканаем з чэсцю.

П. К. КРЫСЕНКА,
брыгадзір торфзавода «Шлях сацыялізма», Добрушскага раёна.

ПАСКОРЫЦЬ РЭКАНСТРУКЦЫЮ МЕНСКАЙ ЭЛЕКТРАСТАНЦЫІ

За апошнія годы Менск адчувае вялікі недахоп у электраэнергіі. Існуючыя дзве станцыі не могуць поўнасцю задаволіць прамысловасць і насельніцтва неабходнай колькасцю энергіі.

Сёлета па рашэнню Соўнаркома СССР для пашырэння Менскай ГЭС-2 выдзелен новы турбагенератар у 6 тысяч кіловат. Устаноўка яшчэ адной турбіны дасць магчымасць павялічыць на 50 процантаў водпуск электраэнергіі гораду.

У адрозненне ад старога абсталявання, новая турбіна з'яўляецца цеплафікацыйнай. Прадпрыемствы і больш буйныя жылёвыя дамы, размешчаныя ў радыусе паўтара-два кілометры ад станцыі (фабрыка «Комунарка», скурзавод «Большэвік» і інш.), будуць цеплафікаваны. Па сваіх тэхна-эканамічных паказальніках турбіна стаіць на ўзроўні лепшых сучасных турбін.

Пры палепшэнні каэфіцыента магутнасці (косінуса Фі) на прадпрыемствах, асноўных спажыўцах электраэнергіі, нагрузку турбагенератара можна будзе павялічыць да 7 тысяч кіловат.

Для ўстаноўкі новай турбіны зараз складаецца тэхнічны праект па рэканструкцыі станцыі ГЭС-2, які будзе гатоў праз 2 месяцы.

Перыяд распрацоўкі праекта неабходна скарыстаць для падрыхтоўчых работ і ў асаблівасці для завозу будаўнічых матэрыялаў. Між тым гэта важнейшая будоўля амаль не забяспечана неабходнымі матэрыяламі. Так, напрыклад, замест паўтара мільёна цаглін Дзяржпланам БССР выдзелена толькі 200 тысяч. Зусім у мізэрнай колькасці адпушчан цэмент (48 тон), круглы і пілены лес (100 кубаметраў). Ёсць пагроза, што пры такіх тэмпах будаўніцтва турбагенератар не будзе пушчан да пачатку асенне-зімовага максімума.

В. І. АУЧЫННІКАЎ,
галоўны інжынер Белэнергаўпраўлення.

МАЛЕНЬКІ ФЕЛЬЕТОН

А СУДДЗІ ДЗЕ?

Ніхто не чакаў, што справа прыме такі абарот. Цяжка было ўявіць, што людзі, якія ўзначальваюць совецкія ўстановы, будуць перакідваць гэту «справу» як мячык, стараючыся, каб мячык з адных рук трапіў у другія і больш не вяртаўся назад. Хто мог падумаць, што для вырашэння пытання, — здавалася-б настолькі яснага і зразумелага,—патрабуецца столькі-ж часу, колькі патрабуецца для правядзення чыгункі!

А справа была так.

На пасевах конзавода № 59 (Гомельскі раён) пачалі заўважацца частыя патравы. Аб'ездчыкі некалькі разоў затрымлівалі коней, устанаўлівалі каму яны належаць, складалі акты.

Дырэктар конзавода паслаў гэтыя акты старшыні Прудоўскага сельсавета для прыняцця мер да патраўшчыкаў.

Старшыня сельсавета адаслаў акты дырэктару для накіравання ў сельскі суд.

Дырэктар накіраваў акты ў сельскі суд.

Сельскі суд вярнуў акты дырэктару для накіравання ў народны суд.

«Справа» абрастала новымі творамі ўдасканаленай канцылярскай тэхнікі.

У народным судзе 1-га ўчастка Гомельскага раёна падышлі да разгляду гэтага пытання вельмі тонка.

— Патравы? Складаная справа! Тут трэба праявіць максімум вынаходлівасці, скарыстаць усё следчае майстэрства. У такой заблытанай справе, як патравы, не разбярэшся без выяўлення ўсіх акалічнасцей злачынства, не разматаўшы ўвесь клубок крымінальных дзеянняў!

Суддзя накіроўвае перапіску начальніку раённага аддзялення міліцыі «для вытварэння дазнання, бо ў справе ўгледжваецца злоснае самаўпраўства».

Не прайшло і чатырох месяцаў, як начальнік міліцыі, нічога не прадпрыняўшы па сутнасці справы, вяртае перапіску ў суд, «бо 131 арт. Крымінальнага Кодэкса не патрабуе папярэдняга дазнання і справа павінна разглядацца непасрэдна судом».

Як бачыце, для ўстанаўлення сэнсу 131-га артыкула Крымінальнага Кодэкса начальніку міліцыі спатрэбілася чатыры месяцы! Гэта можна лічыць новым рэкордам марынавання спраў. Ёсць усе падставы занесці імя аўтара ў табліцу рэкордаў валакіты і бюракратызма.

Тым часам суддзя таксама не драмаў. Атрымаўшы назад перапіску аб патравах, ён палічыў, што яму гэтым самым нанеслі асабістую знявагу.

— Як? Гэта ён, Кірыльчык, законаў не ведае? Хто сказаў? Гэта выходзіць — начальнік міліцыі будзе раз'ясняць яму, Кірыльчыку, законы і выкладаць урок юрыспрудэнцыі! Чулі? Не, я нікому не дазволю ўзяць пад сумненне мае пазнанні ў галіне права!

І тут справа прымае другі напрамак. Патравы, парушальнікі, страты дзяржаўнага прадпрыемства — усё гэта адыходзіць на задні план. На першае месца выступае задзетае судзейскае «я».

Народны суд зноў пасылае перапіску начальніку міліцыі.

Начальнік міліцыі т. Турчэў рашыў настаяць на сваім. Ён вяртае ў суд усю перапіску, паведамляючы, што «такая перапіска загружае органы міліцыі непатрэбнай работай».

І перапіска зноў у народным судзе. Суддзя т. Кірыльчык рашыў цяпер раз назаўсёды пакончыць з валакітай. Надакучыла, відаць, суддзі іграць у мячыкі: усё-такі дарослы дзядзя! Трэба так зрабіць, каб перапіска больш не хадзіла па руках. І Кірыльчык накіроўвае «справу аб патравах»... дырэктару конзавода № 59.

Уся перапіска аб патравах, якая стартавала дзесяць месяцаў таму назад з кабінета дырэктара конзавода, фінішыравала ў гэтым-жа кабінеце пасля няўдала зробленага прабегу па канцылярыях суда і міліцыі.

Спакойна жывецца патраўшчыкам пасеваў у Гомельскім раёне. Ніхто іх не турбуе. Паспрабуйце патурбаваць, калі на іх старане, на варце іх інтарэсаў стаяць народны суддзя Кірыльчык і начальнік міліцыі Турчэў.

С. КРАЎЦОЎ.

ГЕРМАНІЯ СЁННЯ

(АГЛЯД ЗАМЕЖНАГА ДРУКУ)

У апошні час у замежным друку ўсё часцей з'яўляюцца пісьмы людзей, якія набывалі ў Германіі. Гэтыя расказы жывых нагляднымі ілюстрацыямі сённяшняй германскай рэчаіснасці сведчаць аб выключным збядненні мас, зверскай іх эксплаатацыі, упадку культуры ў краіне і агульнай падаўленасці.

Вось перад намі два пісьмы, апублікаваныя ў журнале «Дзі нейе Вельтбюне» і газеце «Дзі Пукунфт», якія выдаюцца ў Парыжы. Французскі рабочы, які правёў пару тыдняў у Германіі, піша:

«Я пабываў у Берліне. Зварачае на сябе ўвагу рэзкі недахоп прадуктаў харчавання. Амаль немагчыма знайсці ў продажу масла, яек і гародніны. Паліцыя разганяе чаргі. На маіх вачах паліцэйскія чыноўнікі адабралі кофе ў хатняй гаспадыні на той падставе, што яна ўхітрылася атрымаць звыш нормы (ёй належала 50 грам., а яна атрымала 100 грам).

З продажу знікае і малако. Рэзка абмежавана выдача малака (нават за грошы) рабочым школьных вытворчасцей. Я бываў у Германіі і раней. Па гэтых школьных прадпрыемствах калісьці віселі плакаты: «Пі кожную гадзіну стакан малака, прымай пасля работы гарачы душ—і ты будзеш здароў». Цяпер ад гэтых плакатаў не асталося і паміну. Умовы работы пагаршаюцца з кожным днём. Толькі-ж за якія-небудзь 5—6 месяцаў рабочы дзень падоўжан на паўтары гадзіны ў сярэднім. Раней рабочы, прапрацаваўшы вядомы тэрмін, мог разлічваць на пенсію. Але сёння гэта выключана. У адным толькі Берліне ў апошні час было знята з пенсій звыш 14 тысяч рабочых...

... Жорсткая эксплаатацыя на германскіх прадпрыемствах, заўсёдашняе недаяданне прыводзяць да росту колькасці самагубстваў сярод германскіх рабочых і ў асаблівасці сярод работніц.

У Германіі пануе страх перад вайной. Гэта сказваецца і ва ўзросшай колькасці выпадкаў дэзертырстваў з арміі і ў разгаворах, якія цыркулююць сярод насельніцтва. Мне прыходзілася гутарыць з рабочымі, рамеснікамі, з настаўнікамі і іншымі. Мой знаёмы настаўнік расказаў мне аб адным вельмі паказальным выпадку. Вучні па спецыяльнаму заданню павінны былі пісаць твор на тэму: «Аб будучай вайне». Мой субяседнік атрымаў гэтыя работы для праверкі. Вучні пісалі аб страху сваіх бацькоў перад вайной. Мой прыяцель пасля праверкі сказаў вучням, што іх творы не дрэнныя, а вечарам дома спаліў усе гэтыя работы».

Аўтар пісьма расказвае далей, што мерапрыемствы фашысцкага ўрада сустракаюць усё большае супраціўленне сярод насельніцтва. Так, ён прыводзіць выпадак, які характарызуе адносіны насельніцтва да розных грашовых збораў, праводзімых фашысцкімі чыноўнікамі:

«Я сядзеў у перапоўненым трамвайным вагоне. Раптам з'явіліся два штурмавікі з кружкамі і пачалі збіраць афіраванні на «зімовую дапамогу». Мой сусед заявіў: «Пакіньце мяне ў супакоі і не перашкаджайце чытаць газету». Другі са злосцю адказаў: «Няма ў мяне грошай. Раней збіралі для «бедных аўстрыйцаў», цяпер збіраеце на «зімовую дапамогу», а заўтра, мабыць, будзеце збіраць для «бедных чэхаў». Штурмавікі паштурхаліся сярод пасажыраў і сканфужаныя сайшлі на астаноўцы. З 70 пасажыраў не больш 4—5 чалавек нешта апусцілі ў іх кружкі. Калі я пасля расказаў аб гэтым майму прыяцелю рабочаму, ён зусім не быў здзіўлен. Ён толькі заўважыў мне: «У нас на прадпрыемстве ўсе так адносяцца да «зімовай дапамогі».

Далей аўтар адзначае асаблівую цікавасць у Германіі да замежных радыёперадач:

«Ніхто не верыць таму, што перадаецца германскімі радыёстанцыямі. Фашысцкія ўлады, страпіўшыя надзею адвучыць насельніцтва ад слухання перадач замежных станцый, цяпер ізымаюць з продажу ўсе больш ці менш магутныя прыёмнікі...

... Сярод германскага народа я наглядаў усё большае імкненне да актыўнай барацьбы з фашызмам. Аўтарытэт антыфашыстаў, працуючых у Германіі нелегальна, выключна вырас. На іх глядзяць як на сапраўдных герояў народа і яны знаходзяць усё больш і больш паслядоўнаў».

Другое пісьмо напісана амерыканскім турыстам, які, паверыўшы на слова фашысцкім брашуркам аб Германіі, распаўсюджваемым у амерыканскіх бюро спадарожжаў, пабываў у гэтай краіне і падзяліўся сваімі ўражаннямі.

«Перад сваім аб'ездам у Германію я чытаў: «Германія—цудоўна і цікава. Наведайце Германію, і вы вынесеце з вашай паездкі незабыўныя ўспаміны». І сапраўды, гэта сняраджэнне не супярэчыць маім уражанням. Я бачыў у Германіі тое, што наўрад ці мне ўдаспа ўбачыць у якой-небудзь іншай краіне.

Замест абяцанай «прыгожасці і цудоўнай прыроды» я знайшоў сапраўднае варварства і грубую паліцэйскую сілу. Я адкрыў там жудасны прыгнёт, пястачу і страх, атавізм і абураючы тэрарызм.

Я быў у Берліне. Берлінскія шўнья, калісьці шумныя і ажыўленыя, сёння поўнустыя. За столікамі сядзяць сумныя, маўклівыя хутчэй пені, чым людзі. Кожны асцерагаецца адзін аднаго. Зусім не чутна ні разгавору, ні смеху. На маё пытанне прыяцелю, чаму яны маўчаць і не смяюцца, той адказаў: «Смех? Чаму можна зараз у Берліне смяяцца?» Я быў сведкай на вакзале ў Берліне цікавай сцэны. Адзін, відавочна вывезены з сябе, рабочы адкрыта выражаў свае незадавальненне рэжымам. Яго схапілі. Але трэба было бачыць твары выпадковых сведак гэтай сцэны, каб зразумець, што яны поўнасцю яму спачувалі. Усе жывуць у страху быць пасаджаным у канцэнтрацыйны лагер. Але і ў такіх выпадках мне прыходзілася чуць антыфашысцкія заявы. Так, мне сказаў адзін рабочы: «Фашызм прабуе прадставіць, што ён выражае волю народа. Але-ж усім вядома, што гэта не так. Прыдзе дзень, і мы яшчэ ўвасцрасім баявыя рэволюцыйныя традыцыі нашага народа».

ПОСПЕХ ВЫСТАЎКІ СОВЕЦКАЙ КНІГІ І МАСТАЦКАЙ ФАТАГРАФІІ Ў АНКАРЫ

АНКАРА, 5 чэрвеня. (ТАСС). Выстаўка совецкай кнігі і мастацкай фатаграфіі ў Анкары карыстаецца вялікім поспехам. Штодня яе наведвае звыш тысячы чалавек.

У кнізе водзываў адзначаюцца велізарныя дасягненні Совецкага Саюза ў выдавецкай справе і ў развіцці фотамастацтва.

«Я з нецярпеннем чакаў,—піша адзін наведвальнік, — адкрыцця такой выстаўкі і з захапленнем разглядаў выстаўленыя кнігі і фатаграфіі. Пасля гэтага я змог ацаніць дасягненні СССР у галіне культуры. Трэба, каб і наша радзіма мела падобныя-ж дасягненні».

«Я жадаю СССР, — піша другі наведвальнік, — далейшага прагрэсу ў галіне прамысловасці і мастацтва». Некаторыя наведвальнікі гадзінамі праседжваюць каля стэндаў і чытаюць кнігі, выданыя на мовах народаў СССР.

Вынікі выбараў венгерскага парламента

Венгерскі друк публікуе афіцыяльныя вынікі выбараў венгерскага парламента, якія адбыліся гэтымі днямі. Як ужо адзначалася, выбары праводзіліся тайным галасаваннем, што, аднак, было толькі пустой фармальнасцю, бо выбары праходзілі ва ўмовах надзвычайнага тэрору.

Венгерскі ўрад прыняў усе меры да таго, каб паралізаваць перадвыбарчую дзейнасць апазіцыйных партый. У прыватнасці, напярэдадні выбараў была забаронена дзейнасць сопыял-дэмакратычных прафсаюзаў, якія выступалі супроць прагерманскага курса ўрада. У адносінах да ўсіх антыфашысцкіх кругоў па ўсёй краіне быў разгорнут люты тэрор. У той-жа час фашысцкія групы атрымалі магчымасць шырока разгарнуць сваю дэмагагічную і тэрарыстычную дзейнасць. Сама сістэма выбараў, як гэта адзначае, у прыватнасці, орган венгерскай сопыял-дэмакратычнай партыі «Непсава», была пабудавана так, каб усякімі сродкамі затрудніць высоўванне і тым больш выбары ў парламент непажаданых ураду і антыфашысцка настроеных кандыдатаў.

Паводле апублікаваных у «Пестэр Лойд» афіцыяльных даных, усяго ў парламент выбрана 260 чалавек. З іх 180 — дэпутаты ўрадавай «партыі венгерскага жыцця», 43 — дэпутаты розных фашысцкіх груп, 14 — дэпутаты кулацкай «партыі дробных землеўласнікаў» (Экгардта), 5 — сопыял-дэмакратаў, 5 — буржуазнай «партыі свабоды», 3 — «хрысціянскага аб'яднання», астатнія — беспартыйныя або належачыя перагаласаванню.

Новы састаў венгерскага ўрада ні ў якай меры не адлюстроўвае сапраўдных настрояў венгерскага народа, у шырокіх кругах якога расце супраціўленне фашысцкаму рэжыму і правадзімай цяперашнім урадам палітыцы. Гэтая палітыка вядзе да поўнай згубы незалежнасці Венгрыі, якая ужо цяпер стала простым прыяткам фашысцкай «асі Берлін — Рым».

4 чэрвеня. (ТАСС).

Да перагляду закона аб нейтралітэце ў ЗША

НЬЮ-ЁРК, 4 чэрвеня. (ТАСС). Як паведамляе вашынгтонскі карэспандэнт газеты «Нью-Ёрк таймс», ва ўрадавых кругах настойваюць на адмене эмбарго (забароны) на вываз зброі ў ваюючыя краіны для таго, каб гэтым самым аказаць дапамогу малым еўрапейскім краінам супроць германскай агрэсіі.

Старшыня сенацкай камісіі па замежных справах Пітмен у гутарцы з прадстаўнікамі друку заявіў, што ў рэзультаце германскага захвату ваенных прадпрыемстваў Шкода ў Чэха-Славакіі, Румынія і іншыя балканскія краіны сталі залежаць ад закупак зброі ў Германіі. Гэта, указаў Пітмен, узмацняе ўплыў фашысцкай Германіі ў Цэнтральнай Еўропе. У Белым доме (рэзідэнцыя Рузвельта) выказваюць жаданне, каб закон аб нейтралітэце быў перагледжан да роспуску кангрэса (парламента) на канікулы ў ліпені.

У ЗША расце лік прыхільнікаў заявы Хэлла аб перагляндзе закона аб нейтралітэце, уключаючага адмену эмбарго на вываз зброі ў ваюючыя краіны.

Не гледзячы на тое, што патрабаванні аб перагляндзе закона аб нейтралітэце ўсё больш узмацняюцца, ізаляцыяністы выступаюць у кангрэсе рашуча супроць перагляду гэтага закона да роспуску кангрэса на канікулы.

Адліў золата з Англіі

ЛОНДАН, 4 верасня. (ТАСС). Па афіцыяльных даных, з Англіі за перыяд з 8 мая па 1 чэрвеня 1939 г. было экспартыравана золата на суму звыш 53 млн. фунтаў стэрлінгаў, з іх асноўная частка ў ЗША і 12 млн. фунтаў стэрлінгаў у Канаду. За той-жа перыяд імпарт золата ў Англію выразіўся ў размеры ўсяго 20.859.932 фунтаў стэрлінгаў. Такім чынам, чысты адліў золата з Англіі за указаны 23-дзённы тэрмін склаў звыш 32 млн. фунтаў стэрлінгаў.

З 27 мая па 1 чэрвеня імпарт золата ў Англію выразіўся ў 3.566.259 фунтаў стэрлінгаў і экспарт — 6.016.035 фунтаў стэрлінгаў, у тым ліку 5.994.665 фунтаў стэрлінгаў у ЗША.

Адліў золата з Англіі толькі за пяць дзён склаў, такім чынам, 2.449.776 фунтаў стэрлінгаў.

Ваенныя дзеянні ў Кітаі

У ЦЭНТРАЛЬНЫМ КІТАІ

Наступленне японцаў у раёне Цяньмыня (на захад ад Уханя) адбіта. Японцы вымушаны былі адыйсці назад у Цяньмынь, страціўшы звыш 200 чалавек забітымі.

У правінцыі Хунань у баях на поўдзень ад Іючжоу з 22 па 25 мая японцы страцілі 3 тыс. чалавек забітымі і каля 4 тысяч ранеными.

У ПАЎНОЧНЫМ КІТАІ

У заходняй частцы правінцыі Шаньсі аднавіліся лютыя баі. У раёне Чжун-Ян-Лішы сканцэнтравана больш 20 тысяч японскіх салдат, 30 гармат, 50 цяжкіх кулямётаў, 200 грузавікоў і многа перапраўачных сродкаў.

Буйныя японскія сілы, выступіўшыя з Чжун-Ян-Лішы і Фыньяна, прасоўваюцца ў яаходнім напрамку ў мэтах фарсіраваць раку Хуанхэ. Кітайскія войскі аказваюць упорнае супраціўленне. Імі прыпынена наступленне японцаў на Лішы і іх прасоўванне на поўдзень ад Лішы. Затрыманню наступлення японцаў спрыяла нечаканая начная атака кітайскіх часцей 1 чэрвеня. У рэзультаце атакі забіта звыш 500 японцаў. Па ўсяму фронту заходняй часткі правінцыі Шаньсі адбываюцца вялікія баі. Японская авіяцыя няспынна бамбардыруе кітайскія пазіцыі ўздоўж ракі Хуанхэ.

31 мая ў паўднёвай частцы правінцыі Шаньсі паўстаў створаны японцамі з мясцовага насельніцтва атрад, які налічваў звыш 500 чалавек. Паўстанне пачалося пасля атрымання загаду аб выступленні атрада ў горы Чунцяошань для барацьбы з кітайскімі партызанамі. Пасля бою з японскімі часцямі паўстаўшыя далучыліся да кітайскіх войск.

ВЫДАННЕ МАТЭРЫЯЛАЎ ТРЭЦЯЙ СЕСІІ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР

Аддзел палітычнай літаратуры Дзяржаўнага выдавецтва БССР выпускае з друку матэрыялы Трэцяй Сесіі Вярхоўнага Совета СССР.

7 чэрвеня паступае ў продаж тыражом у 25 тысяч экземпляраў брашура з дакладам тав. Молатава «Аб міжнародным становішчы і знешняй палітыцы СССР». 10 чэрвеня выходзіць з друку брашура «Даклад Наркома фінансаў тав. Зверэва «Аб дзяржаўным бюджэце СССР на 1939 год».

(БЕЛТА).

Менск—Хабараўск па тэлефону

Восем год таму назад на Менскай міжгародняй тэлефоннай станцыі было яшчэ старое прымітыўнае абсталяванне. Сувязь падтрымлівалася толькі з некаторымі гарадамі БССР і Масквой. За апошнія годы станцыя поўнасцю рэканструявана. Устаноўлена навейшае ўдасканаленае абсталяванне. На працягу сутак адбываецца больш 4.000 тэлефонных перагавораў.

Менск у даны час мае тэлефонную сувязь з 85 буйнейшымі гарадамі Саюза, а праз перадатачныя вузлы (Масква, Кіеў і інш.) з любым пунктам краіны. Так, учора адбыўся першы тэлефонны разгавор Менска з Хабараўскам праз Маскву. Чутнасць была выдатная. Даўжыня гэтай, нядаўна ўступіўшай у эксплаатацыю тэлефоннай магістралі,— каля 9.000 кілометраў. Яна праходзіць праз 18 рэспублік, краёў і абласцей Саюза.

З пачатку гэтага года ўстаноўлена сувязь з гарадамі Чэбаксары, Краснадарам і інш. З Менска можна гаварыць па тэлефону з Архангельскам, Растовам-на-Дану, Алма-Атой, Свердлоўскам.

З кожным годам расшыраецца і ўнутрырэспубліканская тэлефонная сувязь. З красавіка адкрыты новыя дадатковыя лініі для перагавораў з Магілевам, Гомелем і Мозырам. Вядуцца работы па ўстанаўленню дадатковых ліній для сувязі з Масквой і Віцебскам. У бліжэйшы час тэлефонная станцыя пераходзіць на кругласуточную сувязь з Ленінградам.

АДКРЫЦЦЁ ЛЕТНЯГА САДА ПАЛАЦА ПІОНЕРАЎ

Сёння адкрываецца летні сад Менскага палаца піонераў. На адкрыццё сада запрошаны дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР тт. Ванееў і Рачок, дэпутат Вярхоўнага Совета БССР т. Міклашэўская, а таксама байцы і камандзіры гарнізона.

У гэты дзень для піонераў і школьнікаў будуць наладжаны вялікае гулянне, масавыя ігры і танцы, выступленні артыстаў філармоніі і цырка і паказан спектакль кукальнага тэатра.

КАЛГАСЫ СУЦЭЛЬНАЙ ПІСЬМЕННАСЦІ

КРЫЧАЎ. Многа сіл і энергіі прыклалі настаўнікі раёна тт. Палееў, Шыракееў, Халыка, Аляксеева, Дземішкевіч і іншыя ў справе ліквідацыі малапісьменнасці і непісьменнасці сярод дарослага насельніцтва. Дзякуючы іх добрасумленнай рабоце поўнасцю ліквідавана непісьменнасць сярод калгаснікаў сельгасарцелей «Чырвоны сормавец», «Май», «Чырвоны Асцёр», Зарубецкага сельсовета, «Чырвоная Буда», Міхееўскага сельсовета, імені Молатава, Баеўскага сельсовета, і «Шлях соцыялізма», Бельскага сельсовета.

Усяго ў раёне школы па ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці ў гэтым годзе навучылі 1.448 чалавек. Раён заняў першае месца ў вобласці па ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці і з'яўляецца кандыдатам на пераходны чырвоны сцяг аблака.

(БЕЛТА).



У Менскім тэхнікуме электрасувязі абсталявана лабараторыя па тэлевідзенню. НА ЗДЫМКУ (злева направа): студэнтка-дыпломніца Н. М. Нейхачык, тэхнік-лабарант М. С. Хаін і радыётэхнік К. І. Тарнагурскі наглядаюць за тэлеперадачай з Масквы.

Фото А. І. Цанькова (Фотахроніка БЕЛТА).

КАНЦЭРТЫ ХОРА ЛЕНІНГРАДСКАЙ АКАДЭМІЧНАЙ КАПЕЛЫ

Хор Ленінградскай акадэмічнай капелы—адна з самых старэйшых культурных арганізацый. Ён існуе больш двух стагоддзяў. Выконваючы сваё асноўнае назначэнне, як прыдворная царская і культавая ўстанова, хор тым не менш выяўляў і культывіраваў выканаўства свецкай музыкі, спачатку заходняй класікі, а затым і рускай харавой культуры.

Сапраўдны шлях адкрыўся для капелы толькі з перамогай Кастрычніцкай рэвалюцыі. Совецкая ўлада не толькі захавала культурныя каштоўнасці капелы, але і клапаціва расціла калектыў, як народны здабытак, ператвараючы яго ў сапраўдную высокамастацкую культурную адзінку. Зусім зразумела, што рост капелы праходзіў у цяжкіх умовах. Патрабавалася велізарная работа кіраўніцтва і самога калектыва ў вырашэнні задачы знаходжання свайго творчага шляху.

Асабліва востра ўставала пытанне аб рэпертуарнай палітыцы, што вызначае твар калектыва. Недахват твораў совецкіх аўтараў у першыя годы і вузкі замкнуты круг «рапаўшчыны» штурхаў хор капелы то да прымітыву, то да захаплення інструментальнай музыкай, да пераладжання для хора твораў сімфанічнага, камернага плана. І толькі за апошнія годы хор капелы знайшоў сябе.

У гэтым немалую заслугу трэба аддаць пяперашняму кіраўніку калектыва — заслужанаму артысту рэспублікі А. В. Свешнікаву.

Умелае спалучэнне рэпертуара многавяковай класічнай спадчыны і твораў совецкіх кампазітараў, узораў творчасці народаў совецкай краіны, ад манументальных форм да папулярнай песні з кінофільма — надзвычай вялікі, цікавы і патрэбны, правільны аб'ём выканаўскай практыкі хора. Гэта ў той-жа час і яго сапраўдная гарота, у якой закладзены ўсе даныя для няспыннага росту.

Падобнае ўпэўненае ўражанне адразу-ж пакінулі і прайшоўшыя ў Менску два канцэрты хора (у Дзяржтэатры 1 і 2 чэрвеня). Перад слухачамі паўстаў магутны, манументальны і ў той-жа час выключна тлібкі, красачны калектыў, якому аднолькава даступны самыя рознастайныя па характару і настрою творы, таленавіта, тэмпераментна і ўдумліва, чэканна даводзімыя да слухача дырыжорам А. В. Свешнікавым. Выдатныя галасы, добра падабраныя тэмбры ў кожнай асобнай партыі, якія выдзяляюцца сваёй «аксамітнай» гучнасцю, выдатныя актавы напаўняюць то многакрасачнасць аркестравага, то прасторы арганнага гучання.

Усе гэтыя даныя ў дадатку да іх высокага майстэрства, дасканаласці сэрпетыроўкі найбольш пераканаўча выяўляюцца ў выкананні хорам класічных твораў такіх, напрыклад, як арганны васьмігалосны твор Лоці, пяцігалосная Бахаўская фуга, «Узыход сонца» Танеева. Трактоўка і інтэрпрэтацыя гэтых твораў настолькі захапляе, што нават малазнаёмы з такімі творамі слухач адразу-ж адчувае ўсю значымасць выканання хора, магутнасць і сілу яго кульмінацыйных моментаў, шырату дыхання дынамічнага развіцця, майстэрства і яркасць голасавядзення. Выканаўчую чуласць, тонкасць, адшліфаванасць адзелкі, глыбокае разуменне стылю—другую выдатную старану падачы твора хорам выявіла выкананне ў канцэртах «Вячэрняй песні» Перселя, «Рэха» Орланда Ласо.

Зусім асаблівую рысу складае выкананне совецкага рэпертуара. Хор як быццам мяняе свой твар класічнай сур'ёзнасці, стрыманасці; ён выразнік пачуццяў нашай сапраўднасці, яе пад'ёмных настрояў, бадзёрасці, васёласці, лірыкі, любві і дружбы, усмешкі, задору, жартаў. У «Песні аб Сталіне» ён разам з слухачамі славіць правадыра, у грузінскай песні славіць соцыялістычную радзіму, цёпла і задушэўна ў «Праводах» Дамброўскага праважае на граніцу байца (у гэтай песні асабліва хочацца адзначыць добра схваченыя настроі мяккай лірыкі і выдатнае выкананне двух салістак хора), весела, ігрыва сяяе на і жартуе ў «Водовозе» Дунаеўскага і заторна, молада, тэмпераментна гучыць у «Маладзёжнай» Дунаеўскага, рассыпаючы бісер слоў песні.

Дыкцыя хора здзіўляючая. З вялікім пачуццём меры, вынаходнікам і кваліфікавана зроблены апрацоўкі вядомых песень для хора А. В. Свешнікавым. Да рэчы, нас здзіўляе неразуменне велізарнай важнасці апрацоўкі і выканання хорам песень з кінофільмаў, якое выявіла рэцэнзія т. Нісневіча па канцэрты, змешчаная ў нумары газеты «Советская Белоруссия» ад 3/VI, не гаворачы ўжо аб тэрміне «малопенные», яўна няўдалым. Таму мы святома яшчэ раз падкрэсліваем правільнасць узятай хорам рэпертуарнай лініі.

Для ўсёй грамадскасці Беларусі гастролі хора акадэмічнай капелы — значная культурная падзея.

Можна толькі вітаць нашых гасцей з заслужаным поспехам, пажадаць далейшага росквіту і спадзявацца, што за першай сустрэчай паслядуюць другія.

Кампазітар Н. ШЧЭГЛОЎ.

ШАХМАТЫ

Задача № 3

Ph. Klett (з старых задач)



Белыя: Крa1, Фb8, Лg6, Сe3, пп d5,.. (6).

Чорныя: Крe5, Фh2, Сf1, Кd6, пп a2, d3, e4 e7, f3... (9).

Белыя пачынаюць і даюць мат у 2 хады.

***

Пры рашэнні задачы № 1 многія таварышы не ўлічвалі магчымасцей абароны чорных, асабліва хода 1... Задача Клета таксама мае тонкія абаронныя хады чорных. Таму пры рашэнні трэба быць асабліва асцярожным.

МОТАКРОС НА ПЯРШЫНСТВА МЕНСКА

Сёння на 5 кілометры Барысаўскага шасе адбудзецца матацыклетны крос на асабіста-камандзнае пяршынства Менска. У ім прыме ўдзел каля 40 лепшых спартсменаў. Сярод удзельнікаў рэкардсмены БССР тт. Скурчынскі, Камсюк, Рыбакоў, рэкардсменка БССР т. Гантман, студэнтка педінстытута імені А. М. Горкага т. Шандола, студэнтка ордэнаноснага інстытута фізкультуры т. Жодзіна і інш.

У праграме гонкі па перасечанай мясцовасці на дыстанцыю ў 90 кілометраў для мужчын і 40 кілометраў для жанчын. Частку шляху ўдзельнікі пройдуць у працівагазах.

Пераможца атрымае званне чэмпіёна горада па кросу 1939 г.

***

З 24 футбольных каманд Менскай вобласці, удзельнічаўшых у занальных спаборніцтвах на пяршынства «Кубка БССР», к поўфіналу асталіся 4 каманды. Сёння ў поўфінальных матчах па футболу на стадыёне гарадскога совета (былы Ўсебеларускі) сустрэнуцца каманды ордэнаноснага інстытута фізкультуры і Політэхнічнага інстытута, на стадыёне «Дынама» імені Кірава — каманды спартыўнага таварыства «Дынама» і Н-скай часці.

ПРОМТАВАРЫ ДЛЯ СЯЛА

У красавіку і маі ў БССР для сяла завезена розных промтавараў больш чым на 40 мільёнаў рублёў, у тым ліку мануфактуры на 13 мільёнаў рублёў, швейных вырабаў на 11 млн. рублёў, абутку на 4.500 тыс. рублёў, галаўных платкоў на 2,5 мільёна рублёў, трыкатажа на 3 мільёны рублёў і т. д. Да канца бягучага квартала калгасная вёска атрымае гэтых жа тавараў яшчэ на 24 мільёны рублёў. План адгрузкі па большасці тавараў выконваецца датэрмінова.

ДЗЕННІК

7 чэрвеня, у 7 гадзін вечара, у вялікай зале Дома партактыва аддзел прапаганды і агітацыі Менгаркома КП(б)Б праводзіць публічную кіналекцыю на тэму «Аб творчасці вялікага рускага пісьменніка і барацьбіта за перамогу комунізма А. М. Горкага».

Лектар — прафесар Маскоўскага інстытута гісторыі, філасофіі і літаратуры т. Нейман.

7 чэрвеня, у 7 гадзін вечара, у памяшканні Партыйных курсаў (аудыторыя 51) для вывучаючых гісторыю ВКП(б), агітатараў і бяседчыкаў Сталінскага раёна праводзіцца лекцыя на тэму «Праблема вялікай Волгі».

Лектар тав. Зундзілін.

Білеты — у РК КП(б)Б.

В. а. адказнага рэдактара Д. Т. ЛЕБЕДЗЕЎ.

Гастролі Дзяржаўнага Рускага тэатра музыкальнай камедыі БССР (Памяшк. Дзярж. Ўкраінск. тэатра БССР)
6 чэрвеня
«СВАДЬБА В МАЛИНОВКЕ»
Пачатак у 8 г. веч. Білеты ў касе тэатра з 11—2 і з 5 г. веч.

Дырэкцыя Дзяржаўнага вялікага тэатра оперы і балета
ДАВОДЗІЦЬ ДА ВЕДАМА,
што АБАНЕМЕНТЫ з 96 нумара САПРАЎДНЫ ў другой палавіне сезона 1939 года, г. зн. са жніўня месяца г. г.

ДЗЯРЖАЎНАЯ ФІЛАРМОНІЯ БССР (Памяшканне Беллдзярждрамтэатра)
Абяўленыя на 5 і 6 чэрвеня
КАНЦЭРТЫ салиста Маскоўскага ордэна Леніна Акадэмічнага Вялікага тэатра СССР Д. Г. БАДРЫДЗЕ
ПЕРАНОСЯЦЦА НА 12 і 13 ЧЭРВЕНЯ.
Купленыя білеты на 5 чэрвеня сапраўдны на 12 чэрвеня; білеты на 6 чэрвеня сапраўдны на 13 чэрвеня.
Астаўшыяся білеты прадаюцца ў касе тэатра і ў касе магазіна санітарыны і оптыкі (пр. Леніскай і Совецкай) з 3 гадзін дня.

Кінотэатр «ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА»
ВОГНЕННЫЯ ГОДЫ

Кінотэатр «Родина»
ІШОЎ САЛДАТ З ФРОНТА

Кінотэатр «Парыжская Комуна» (Пушкіна, 64)
ЧАПАЕЎ

Дзіцячы кінотэатр
ЛЕНІН У 1918 ГОДЗЕ

Кінотэатр «НАВІНЫ ДНЯ»
1. Тамара Ханум.
2. Начальнік дарогі (кінонарыс).
3. Журнал Мевскай студыі кінохронікі № 27.

Кінотэатр «СПАРТАК»
ПЕТЭР

Кінотэатр «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ»
ПРЫВАТНАЕ ЖЫЦЦЁ ПЕТРА ВІНАГРАДАВА

ДЗЯРЖЦЫРК
СЁННЯ І ШТОДЗЕННА
ГАСТРОЛІ
буйнейшага атракцыёна
КІТАЙСКІ НАРОДНЫ ЦЫРК.
20 ВАН-Ю-ЛІ 20
Сёння, 6 чэрвеня, ДВА ЦЫРКАВЫЯ ПРАДСТАЎЛЕННІ.
Пачатак дзённага прадстаўлення ў 2 г. дня. Каса адкрыта з 10 г. раніцы.
Удзельнічае ўся трупа. Пачатак вячэрняга прадстаўлення ў 9 гадзін вечара.
Каса адкрыта з 12 да 2 г. і з 5 г. веч.
Каса ў Доме ўрада адкрыта штодзенна з 12 да 5 гадзін веч.

Кінотэатр „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА“
з 7 чэрвеня
НОВЫ ГУКАВЫ МАСТАЦКІ ФІЛЬМ
„ЧАЛАВЕК У ФУТЛЯРЫ“
па А. П. ЧЭХАВУ.
Фільм рысуе затхлыя норавы, коснасць і ўбоства мыслей, абстаноўку ўгодніцтва і падхалімства ў старой царскай Расіі.
У ГАЛОЎНЫХ РОЛЯХ:
нар. арт. СССР Н. П. ХМЕЛЕЎ, засл. арт. респ. М. ЖАРАЎ, нар. арт рэсп. О. АНДРОЎСКАЯ.
нар. арт. рэсп. В. ГАРДЗІН, засл. арт. рэсп. Ф. РАНЕЎСКАЯ і інш.
НА ЛЕТНЯЯ ЭСТРАДЗЕ
выступае ЛЕНІНГРАДСКІ ВАКАЛЬНЫ АНСАМБЛЬ у суправаджэнні СІМФАНІЧНАГА АРКЕСТРА пад кіраўніцтвам Н. КЛАУСА і арт. балета Ж. БЛАЖЭВІЧ і С. РАДЛІНСКІ. Канферансье Зін. ЗАДОРЫН.

Гомельскія дзяржаўныя педагагічны і настаўніцкі інстытуты імені В. П. Чкалава
АБ'ЯУЛЯЮЦЬ АСЕННІ НАБОР СТУДЭНТАЎ
НА 1939/40 ВУЧЭБНЫ ГОД.
ПЕДАГАГІЧНЫ ІНСТЫТУТ: на фізіка-матэматычны факультэт, прыродазнаўчы факультэт і факультэт літаратуры і мовы.
Педінстытут рыхтуе выкладчыкаў сярэдняй школы, тэхнікумаў і рабфакаў па фізіцы, матэматыцы, прыродазнаўству, літаратуры і мове. Тэрмін навучання — 4 годы.
НАСТАЎНІЦКІ ІНСТЫТУТ: на фізіка-матэматычнае аддзяленне, аддзяленне літаратуры і мовы і прыродазнаўчае аддзяленне.
Настаўніцкі інстытут рыхтуе выкладчыкаў пачатковай сярэдняй школы па фізіцы, матэматыцы, літаратуры і мове, прыродазнаўству. Тэрмін навучання — 2 годы.
У педагагічны інстытут прымаюцца асобы, якія маюць поўную сярэднюю адукацыю, а ў настаўніцкі — не ніжэй 9 класаў сярэдняй школы.
Скончыўшыя 10-годку з адзнакай «выдатна» залічваюцца без іспытаў.
Да заявы неабходна прыкласці падрабязную аўтабіяграфію, атэстат аб скончанні сярэдняй школы (арыгінал), даведку аб стане здароўя і дзве завераныя фотакарткі (без галаўнога ўбора). Пашпарт прадчяўляецца асабіста.
УВАГА: У аўтабіяграфіі паступаючы павінен паведаміць аб сабе наступныя весткі: год і месяц нараджэння, нацыянальнасць, грамадзянства, партыйнасць, прыналежнасць да ЛКСМ, адукацыя, прафесія, спецыяльнасць, вытворчы стаж, сямейнае становішча, даныя аб заработку і адносіны да вайсковых абавязкаў.
У заяве трэба ўказаць, які факультэт і спецыяльнасць паступаючы выбірае, а таксама ў заяве павінен быць паказан і дакладны адрас паступаючага.
Настаўнікі, якія паступаюць у інстытут, павінны мець згоду раёна аб водпуску іх на вучобу.
Прыём заяў аб залічэнні ў інстытут праводзіцца з 20 чэрвеня па 25 жніўня; на вячэрняе аддзяленне—з 15/III па 15/VI.
Прыёмныя іспыты абдудуцца з 1 па 25 жніўня. Залічэнне ў саставу студэнтаў пасля ўсіх іспытаў—з 21 па 29 жніўня г. г.
Іншагароднія студэнты забяспечваюцца інтэрнатам. Стыпендыя ад 130 да 200 руб., згодна пастановы СНК СССР ад 10/XI—1937 г.
Заявы з дакументамі накіроўваць па адрасу: г. Гомель, Пролетарская, 2, педагагічны інстытут, прыёмнай камісіі.
ДЫРЭКЦЫЯ.

Інстытут павышэння кваліфікацыі надраў народнай асветы БССР
аб'яўляе НАБОР
НА ЗАВОЧНЫЯ АДДЗЯЛЕННІ НАСТУПНЫХ ПЕДВУЧЫЛІШЧ:
1. Барысаўскае
2. Віцебскае
3. Гомельскае
4. Лепельскае
5. Магілеўскае
6. Мсціслаўскае
7. Мазырскае
8. Менскае
9. Аршанскае
10. Полацкае
11. Рэчыцкае
12. Рагачоўскае
13. Слуцкае
14. Магілеўскае дашкольнае педвучылішча.
Настаўнікі, паступаючыя на заочнае навучанне ў педагагічныя вучылішчы, абавязаны падаць на імя дырэктара педвучылішча заяву, аўтабіяграфію, дакумент (або завераную копію) аб адукацыі, дзве фотакарткі і даведку аб месцы работы.
Настаўнікі 1—4 класаў, маючыя адукацыю за 7 класаў сярэдняй школы, прымаюцца ў 1 клас без іспытаў.
Настаўнікі, маючыя адукацыю за 7 класаў сярэдняй школы і скончыўшыя 5—10-месячныя педкурсы, а таксама скончыўшыя 8 класаў сярэдняй школы, прымаюцца без іспытаў у другі клас, а маючыя асвету за 9 класаў сярэдняй школы прымаюцца без іспытаў у 3 клас.
Комсоргі школ, піонерважатыя ў школах, кіраўнікі і выхавацелі дашкольных устаноў, дзіцячых дамоў, бібліятэкары і іншыя работнікі народнай асветы могуць паступаць на заочныя аддзяленні педвучылішч пры ўмове адпаведнай падрыхтоўкі (адукацыя не ніжэй 7 класаў сярэдняй школы) на агульных падставах, з абавязковай здачай іспытаў у аб'ёме праграмы для паступаючых у 1 клас стацыянарнага педвучылішча.
ДЫРЭКЦЫЯ.

АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАВЕЦТВА: Менск, Совецкая, 49. ТЭЛЕФОНЫ РЭДАКЦЫІ: рэдактара — 21-352; намесніка рэдактара — 25-188; сакратарыята — 21-846. Аддзелаў: партыйнага — 21-353; совецкага будаўніцтва і гандлю — 23-413; прамысловага — 21-350; сельскагаспадарчага — 20-830; літаратуры, мастацтва, навукі і асветы — 23-955; мясцовай і замежнай інфармацыі — 25-189; пісем — 20-844, 21-309; 21-885; ілюстрацыйнага і стыльрэдактуры — 21-556; заг. выдавецтвам — 21-358; аб'яў — 21-845.

Уп. Галоўлітбела № К—1069. Менск, друкарня «Звязды», Совецкая, 49. К., Л., Ш. 3